ЛіМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 26 (4981) 6 ліпеня 2018 г.

ISSN 0024-4686

16 +

Погляд з сучаснасці стар. 5

Яны стваралі Беларусь стар. 6

Эпахальнае палатно стар. 12

Свята кожнага дня

Фота Belta

Незалежнасць — слова, якое на вуснах. Паўтараем яго і не задумваемся: колькі вякоў народ, што насяляў гэтую зямлю, ішоў да яго. Імкнёмся зразумець, колькі вынес ужо толькі для таго, каб быць. Каб быць сабой, каб мець права на ўласную будучыню.

У кожнага пакалення ёсць момант, калі яно дае свой адказ: што значыць для яго незалежнасць краіны? Што нам трэба рабіць дзеля яе, калі, здаецца, асаблівых выпрабаванняў жыццё не падкідвае? Адказы патрабуюцца штодня — на кожным кроку могуць узнікнуць моманты, калі неабходна вызначыць: што значыць быць грамадзянінам незалежнай краіны?

Мець права жыць у Беларусі? Любіць, але не толькі абстрактна, а ствараючы багацце для яе сёння? Абараняць тое, што маштабна ці па драбніцах захоўвае памяць аб тым, як здабывалася незалежнасць, як паўставала краіна? Усё разам і крыху больш. Бо ў карагодзе святаў яна адна, у віры штодзённых клопатаў можа быць іншай. Але ў любы час ёй патрэбна ўвага. Неабыякавасць да ўсяго, што датычыцца радзімы. І тады незалежнасць не трэба тлумачыць. І тады кожны дзень — свята.

Працяг на стар. 2 ►

ISSN 0024-4686

9 770024 468001 18026

Акцэнты тыдня:

краіна

Дзень Незалежнасці. «Гэта свята, якое аб'ядноўвае лёсы розных пакаленняў, нагадвае пра доўгі і няпросты шлях станаўлення нашай дзяржавы. Мы ведаем цану сапраўднай свабоды. Усведамляем сілу адзінства народа, яго патрыятызму і веры ў будучыню. Разумеем, што суверэнітэт — гэта наш галоўны здабытак», — падкрэсліў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ў віншаванні суайчыннікам з нагоды Дня Незалежнасці. «Наш свяшчэнны абавязак — захоўваць памяць пра Вялікі Подзвіг, перадаваць яе будучым пакаленням, берагчы і ўмацоўваць мір на сваёй зямлі, стваральнай працай рабіць яе багацейшай і прыгажэйшай», — адзначыў Кіраўнік дзяржавы.

Памяць. Прэзідэнт Беларусі падчас мерапрыемства, прысвечанага памяці ахвяр нацызму на тэрыторыі былога лагера смерці «Трасцянец», заклікаў захаваць праўду аб вайне і не дапусціць адраджэння страшнага мінулага. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што беларускім архітэктарам удалося ўвасобіць у мемарыяле тонкую грань паміж жыццём і смерцю, пераступіўшы якую жывы чалавек ператвараўся ў жменю попелу. Аляксандр Лукашэнка выказаў словы ўдзячнасці прысутным на мерапрыемстве прэзідэнтам, палітыкам і грамадскім дзеячам, прадстаўнікам рэлігійных арганізацый, кіраўніцтву і жыхарам еўрапейскіх гарадоў, усім неабыякавым, агульнымі намаганнямі якіх захоўваецца памяць пра ахвяры «Трасцянца», і прапанаваў падтрымаць ініцыятыву беларускага боку па стварэнні электроннай Кнігі памяці ахвяр «Трасцянца».

Моладзь. Напрыканцы мінулага тыдня Кіраўнік дзяржавы ўзяў удзел у Рэспубліканскім балі выпускнікоў устаноў вышэйшай адукацыі, пажадаў выпускнікам быць моцнымі, верыць у сябе і ставіць высокія і высакародныя мэты. «Вы — дзеці сучаснай, незалежнай Беларусі. І калі да зразумелага імкнення дасягнуць вялікіх вышынь у кар'еры, палепшыць сваё матэрыяльнае становішча ў вас дабавіцца шчырае жаданне быць карысным сваёй Радзіме, то яе будучыня — у надзейных руках. Таму будзьце моцнымі. Верце ў сябе, хаця б як я веру ў вас», — звярнуўся Прэзідэнт да моладзі.

Спадчына. Беражлівае стаўленне да культурнай спадчыны ўмацоўвае суверэнітэт краіны, падкрэсліў міністр культуры Беларусі Юрый Бондар падчас урачыстага адкрыцця свята «Дзень вышыванкі», якое прайшло 2 ліпеня ў Мінску. Юрый Бондар адзначыў, што маладзёжная акцыя «Дзень вышыванкі» набірае папулярнасць. «Паважлівае стаўленне да культурных традыцый — адметная рыса менталітэту беларускіх людзей. Мы беражліва захоўваем тую культурную спадчыну, якую пакінулі продкі: нашы народныя песні, танцы, абрады, выдатныя творы прыкладнога мастацтва — усё гэта далучае нас да нашай гісторыі, дае магчымасць усвядоміць нацыянальную ідэнтычнасць і ўмацоўвае дзяржаўны суверэнітэт», — сказаў ён.

Выстаўка. Унікальныя архіўныя здымкі вызваленага ад нямецка-фашысцкіх акупантаў Мінска прэзентавала БелТА на фотавыстаўцы ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Юбілейная фотавыстаўка «Імгненні стагоддзя» — знаёмства з асноўнымі вехамі ў гісторыі Беларусі з 1918 года па цяперашні час. Галоўнымі экспанатамі сталі 23 вялікія плакаты ў выглядзе шырокафарматных здымкаў з фотаархіва БелТА, што паказваюць Мінск вызвалены, які адбудоўваецца пасля вайны.

Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ

Водгалас

Свята кожнага дня

Фота БелТА.

Незалежнасць — гэта яшчэ і праверка нацыі на спеласць, і ўзнагарода за яе. Як падарунак мы ўспрымаем гэтае свята цяпер. Каштоўны падарунак найперш ад нашых продкаў: іх подзвігі і высілкі далі магчымасць існаваць і радавацца жыццю, іх мары і памкненні здолелі ператварыць рэчаіснасць і ўпісаць у яе імя Беларусі. І ў нейкім сэнсе даніна ім (іх памяці ці традыцыям) — жаданне святкаваць шырока, з парадам і канцэртамі. Каб кожны (нават маленькі грамадзянін) мог адчуць: гэта не проста выхадны дзень.

Спяваць гімн разам — у гонар радзімы. Глядзець, як квітнее яе неба пры выбухах — але выключна мірных, падчас салюту. Бо незалежнасць — гэта прыгожа, творча, натхняльна і гістарычна.

Таму як пралог — свята вышыванкі, калі этнічныя арнаменты гавораць пра неабыякавасць тых, хто з гонарам апранае адзенне з імі. Вышыванка-*style* ўжо не ўспрымаецца выключна як архаіка, а становіцца прыкметай высокага густу, характарызуе самасвядомасць чалавека. Этнічныя колеры Беларусі так ці інакш звяртаюць да каранёў, прымушаюць выкрышталізоўваць этапы, праз якія адбывалася развіццё: род — народ — нацыя.

Зварот да гісторыі гучаў падчас урачыстага сходу: важна не сказіць, захаваць для нашчадкаў кожны факт з мінуўшчыны, каб разумець, які доўгі і цяжкі быў шлях да атрымання нацыянальнай дзяржаўнасці, наколькі няпроста беларусам было зберагчы сваю этнічную самабытнасць. І падставы для гонару за такую гісторыю ёсць: першае перадавое права ў Еўропе, якое лягло ў аснову канстытуцый многіх дзяржаў, першыя падручнікі, кнігі, навуковыя работы, развіццё адукацыі. І здольнасць абараняць свае набыткі-напрацоўкі, адстойваць сваю частку зямлі і жыццё на ёй, якое ідзе ў сваіх традыцыях, а не пад дыктоўку чужынцаў, што засведчылі выпрабаванні мінулага стагоддзя.

Паразважаць пра жыццё Беларусі дазволіла тэатралізаванае прадстаўленне «Мой родны кут». Назвы ўсіх гарадоў і пасёлкаў гарадскога тыпу Беларусі прадставілі дзеткі — увасабленне будучыні малой радзімы. Але гледзячы на гэты парад назваў, думалася, што «малая радзіма» — усяго толькі ўстойлівы выраз, бо насамрэч усё гэта часцінкі вялікага агульнага: гэтыя назвы і людзі, што з імі звязаныя, разам утвараюць Беларусь. Як прызнанне ёй — тысяча паветраных шароў у форме сэрца ды аэрастат з надпісам «Мая Радзіма».

Казаць пра любоў да яе ніколі не зашкодзіць. І калі гэта ўваходзіць у звычку, то з яе вырастае і ўмацоўваецца цёплая (амаль сямейная) традыцыя: быць разам і ў горы, і ў радасці.

Ёсць нагода — і людзі радуюцца. Калі гучаць нашы песні, калі спяваюць іх на роднай мове, па-беларуску, калі на сцэну гала-канцэрта ля стэлы «Мінск — горад-герой» разам з зоркамі выходзяць маладыя і нават вельмі юныя таленты, якія дакладна ведаюць, як называецца іх краіна, памылак тут быць не павінна…

Марыя АСІПЕНКА

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

На здымках: адметныя моманты свята.

Фестываль

ДЗІВОСЫ ДЛЯ АМАТАРАЎ

Квэст для пошуку папараць-кветкі, феерверк і дыскатэка да раніцы

Кніжныя прэзентацыі і сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі чакаюць гасцей на свяце «Купалле» ў Александрыі («Александрыя збірае сяброў»). Як паведамілі ў Міністэрстве інфармацыі, сваю праграму прадставяць айчынныя кнігавыдаўцы і кнігараспаўсюджвальнікі. Прадугледжана шмат цікавых культурных мерапрыемстваў, сярод якіх — прэзентацыі беларускіх кніг і часопісаў, сустрэчы з аўтарамі падчас акцый «Культурны маршрут "Мая Беларусь: сучасныя пісьменнікі — дзецям"», правядзенне літаратурнай віктарыны на тэму малой радзімы. Акрамя таго, пройдзе выстаўка-продаж друкаванай прадукцыі.

Купальскі фэст у Александрыі сёлета збярэ каля 1,5 тысячы выканаўцаў з Беларусі, Расіі, Латвіі, Эстоніі, Украіны, Літвы, Польшчы, Германіі. Але галоўнае прадстаўленне мае назву, актуальную сёлета для Беларусі: «Малая радзіма».

Усё, чым мы багатыя, прадэманструюць на фэсце. Кніжныя навінкі прапануюць беларускія выдавецтвы на «Друкарскім двары». «Горад майстроў» далучыць да народных традыцый рамёстваў. Вялікая выстаўка-кірмаш «Купальскія дзівосы» будзе арганізавана ў выглядзе стылізаваных вуліц. На адной з іх прэзентуюць розныя фестывалі, што ладзяцца на Магілёўшчыне: «Сенафэст», «У госці да радзімічаў», «Зялёныя святкі», «Пісьмянкоў луг», «Дрыбінскія таржкі», «Рыцарскі фэст» і інш. Адна з вуліц — «Беларуская» — прадставіць фэсты з розных рэгіёнаў Беларусі. Замежныя госці размесцяцца на вуліцы «Міжнароднай».

Міжнародны кірунак на Купальскім фэсце (але ўжо асобна і на канцэртнай пляцоўцы) увасобіць і прэзентацыя I Еўрапейскіх гульняў, што прыме Беларусь у 2019 годзе.

Галоўнае сцэнічнае дзейства будзе трансліравацца адначасова на некалькіх святлодыёдных экранах. Публіцы прапануюць размясціцца ў партэры, дзе арганізавана каля 3000 месцаў. Госці ў купальскіх касцюмах могуць паўдзельнічаць у конкурсе. Пераможцам арганізатары абяцаюць падарункі. Канцэрт аздобіць яскравы купальскі феерверк. Моладзь можа працягнуць шукаць папараць-кветку падчас квэсту ці застацца на начную дыскатэку. Другі фестывальны дзень будзе прысвечаны ўшанаванню працаўнікоў вёскі.

Арганізатарамі свята з'яўляюцца Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Магілёўскі аблвыканкам і Шклоўскі райвыканкам.

Мінскае гарадское аддзяленне СПБ запрашае:

***7 ліпеня** — на літаратурнае свята — творчы конкурс у Палац ветэранаў з удзелам паэтаў (11.00).*

***9 ліпеня** — на прэзентацыю кнігі паэтэсы Іны Фраловай «Рамонкі на асфальце» ў межах акцыі «Лета з добрай кнігай» у дзіцячую бібліятэку № 15 (11.00).*

***10 ліпеня** — на сустрэчу з пісьменнікам і выдаўцом Міхаілам Дзеравянкам у межах акцыі «Лета з добрай кнігай» у публічную бібліятэку № 7 (11.00).*

***10 ліпеня** — на музычна-літаратурную імпрэзу з удзелам пісьменнікаў у Мінскі гарадскі дзіцячы аздараўленчы цэнтр «Лідар» (17.30).*

***12 ліпеня** — на свята дзіцячай кнігі ў межах акцыі «Лета з добрай кнігай» у дзіцячую бібліятэку № 15 (11.00).*

***12 ліпеня** — на юбілейны творчы вечар паэта, лаўрэата Нацыянальнай літаратурнай прэміі Анатоля Аўруціна ў Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа (16.00).*

Магілёўскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

***7—8 ліпеня** — на рэспубліканскае свята «Александрыя збірае сяброў» з удзелам старшыні абласнога аддзялення Алеся Казекі і пісьменнікаў Магілёўшчыны на пляцоўку ААТ «Магілёўсаюздрук» у вёску Александрыя Шклоўскага раёна (11.00).*

***12 ліпеня** — на сустрэчу з Віктарам Кунцэвічам у сярэднюю школу № 1 імя М. І. Пашкоўскага г. Бялынічы (10.00).*

З нагоды

ПРАДСТАЎЛЕНЫ ЎПЕРШЫНЮ

матэрыялы з прыватнага архіва нашчадкаў Якуба Коласа

Убачыць іх можна ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа, дзе адкрылася вельмі цікавая, хаця і часовая, экспазіцыя «Ірдзяцца зоры нашых дзён», прымеркаваная да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.



Фота Аляксандра Крыжэвіча.

Фрагмент экспазіцыі.

Дата 3 ліпеня займае асаблівае месца ў гісторыі нашай краіны і лёсе беларускага народа. Гэта свята ўсіх, хто ганарыцца сваёй краінай, шануе яе гісторыю, хто сваёй працай і талентам кожны дзень робіць унёсак у росквіт роднай зямлі.

Якуб Колас увесь час сэрцам і думкамі быў з беларусамі, якія змагаліся за свабоду і жыццё. У Ташкенце працавала Акадэмія навук Беларусі, там жа выйшаў зборнік песняра «Голас зямлі» і паэмы «Адплата», «Суд у лесе». Друкаваліся патрыятычныя вершы, артыкулы, у якіх моц і трывучасць беларусаў у змаганні за ўласную свабоду ставіліся ў прыклад.

На выстаўцы ўпершыню прадстаўлены матэрыялы з прыватнага архіва нашчадкаў Якуба Коласа, асабістыя рэчы і прыжыццёвы партрэт паэта, прывезеныя з Ташкента, фотаздымкі, невядомыя лісты песняра ды і інш.

Міра ІЎКОВІЧ

Стасункі

Культурна, па-суседску

Пра адметнасць Украіны распавядаюць яе творчыя сілы

Учора ў Палацы Рэспублікі адбылося ўрачыстае адкрыццё Дзён культуры Украіны ў Рэспубліцы Беларусь. Краіна-суседка прадстаўляе ў Беларусі праграму, праз якую імкнецца засведчыць: у яе культуры магутны дух, якім сілкуюцца таленавітыя людзі, здольныя захапіць сваім мастацтвам. І няважна, ці то гэта народныя рамёствы (на выстаўцы можна адчуць іх асаблівасць і адметнасць, параўнаць з беларускімі), ці то віды мастацтваў, дзе ствараюцца высокія ўзоры.

Сустрэчы падчас Дзён культуры адметныя тым, што нават даўнія знаёмыя здольныя адкрывацца наноў, як, напраклад, Нацыянальны заслужаны акадэмічны ансамбль танца Украіны імя П. Вірскага, які неаднойчы быў госцем у Беларусі (прынамсі, прадстаўляў сваю краіну на «Славянскім базары ў Віцебску»). Але кожны выступ гэтага калектыву непаўторны і заварожвае: іх танцы запальваюць імпэтам, дзівяць скачкамі і эмацыянальнымі рухамі, з розных эпізодаў і сюжэтаў складаецца агульны малюнак кампазіцыі, па якой пазнаеш краіну, дзе жывуць кемлівыя, актыўныя, працавітыя людзі, якіх сілкуе любоў і павага адзін да аднаго, а ўсіх разам — да радзімы. Здаецца, што вобраз сваёй краіны ўкраінцы носяць у сэрцы. Гэта падкрэсліваюць і каларытныя касцюмы артыстаў калектыву, якія шмат пра што распавядаюць без слоў.

Пра сваё сучаснае жыццё і пачуцці, што перажываюць людзі, госці распавядаюць і на сваёй роднай мове: на ёй прыгожа гучаць не толькі старыя вядомыя нам песні, але і сучасныя хіты. Але ўкраінская эстрада сёння розная. Адметная яна тым, што арыентуецца на сваіх слухачоў, але мае чым здзівіць іншых. Прыемныя сустрэчы з народнымі артыстамі Украіны Цінай Караль ці Іва Бабулам, заслужанай артысткай Украіны Ленарай Асманавай, папулярным спяваком Алегам Віннікам, гуртом «*Luiku*», Златай Огневіч, квартэтам «Гетман».

І яшчэ адна асаблівасць гэтых дзён: украінская культура імкнецца раскрыцца з розных бакоў. І шмат каго павінна зацікавіць праграма ўкраінскага кіно ў сталічных кінатэатрах: за гады незалежнасці гэтая краіна здолела здзівіць актуальнымі тэмамі, новымі імёнамі, небанальным поглядам на новую рэчаіснасць.

На гэты раз Дні культуры Украіны абяцаюць прыемныя сустрэчы не толькі ў Мінску, але і ў Магілёве і Гомелі. Напрыклад, госці з Украіны завітаюць на купальскае свята ў Александрыі. Тут дарэчы будзе знакаміты і багаты «Сарочынскі кірмаш». Ды і выдатнае месца для прадстаўленняў коннага тэатра «Кіеўская Русь». 8 ліпеня на пляцоўках купальскага свята выступяць артысты Нацыянальнага заслужанага ансамбля танца Украіны імя Паўла Вірскага і папулярныя зоркі ўкраінскай эстрады. А ўжо 10 ліпеня ўкраінскіх артыстаў можна будзе пабачыць на сцэне Гомельскага грамадска-культурнага цэнтра.

Гэтымі днямі разам з майстрамі культуры ў Беларусі гасцююць прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі Украіны: у нас таксама ёсць чаму здзіўляцца і што адкрываць — нават суседзям і сябрам.

Марыя АСІПЕНКА

Імпрэза

У стылі пазамінулага стагоддзя

На свята ў шляхецкім стылі пачатку XIX стагоддзя запрашае рэдакцыя газеты «Вместе!» разам з Беларускім таварыствам інвалідаў.

Імпрэза з нагоды 30-годдзя аб'яднання будзе ладзіцца 7 ліпеня ў сталічным Палацы ветэранаў. Госці свята змогуць акунуцца ў атмасферу пазамінулага стагоддзя: прайсціся разам паланэзам, зрабіць імгненны здымак на ўспамін у стылізаванай фотазоне, паслухаць музыку і спевы тых часоў.

У праграме — канцэртныя нумары артыстаў ад абласных арганізацый Беларускага таварыства інвалідаў. Перад гасцямі выступяць вядомыя беларускія выканаўцы: гурт «*NaviBand*», які ўдзельнічаў у конкурсе «Еўрабачанне-2017», гурт «ТяніТолкай», Ірына Сапунова, Вольга Шона, Вераніка Німірава. Да святкавання юбілею далучыцца кампазітар Ігар Лучанок.

У імпрэзе возьмуць удзел старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па працы і сацыяльных пытаннях Тамара Красоўская і член камісіі Юлія Мурына, а таксама прадстаўнікі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны насельніцтва Беларусі, грамадскіх арганізацый інвалідаў.

Падчас свята будуць падведзены вынікі творчага конкурсу «30 гадоў разам з БелТІ», які праводзіла газета «Вместе!».

Бажэна СТРОК

ЛіМ КАЛЯНДАР

8 ліпеня 60-гадовы юбілей святкуе Уладзімір Каральчук, кампазітар.

10 ліпеня 55-годдзе святкуе Вольга Савасцюк, пісьменніца.

10 ліпеня 55 гадоў спаўняецца Валянціну Семяняку, пісьменніку.

10 ліпеня — 105 гадоў з дня нараджэння Ніны Вайтовіч (1913—1976), мовазнаўцы.

11 ліпеня 60-гадовы юбілей адзначае Валянціна Паліканіна, паэтэса.

11 ліпеня — 110 гадоў з дня нараджэння Вольгі Захаравай (1908—1981), актрысы, заслужанай артысткі БССР.

11 ліпеня — 85 гадоў з дня нараджэння Мікалая Красоўскага (1933—1989), артыста балета, педагога, заслужанага артыста БССР.

12 ліпеня — 100 гадоў з дня нараджэння Мікалая Шышкіна (1918—2000), артыста эстрады, спевака, заслужанага артыста БССР.

Люстэрка тыдня:

свет

У мінулую пятніцу распачаўся 53 Міжнародны кінафестываль у Карлавых Варах (*KVIFF*), які называюць культурным мостам паміж краінамі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Першы паказаны фільм на *KVIFF* сёлета — «Любоўныя прыгоды бландзінкі» (1965 год), зняты рэжысёрам Мілашам Форманам, які нядаўна пайшоў з жыцця. На цырымоніі адкрыцця фестывалю галоўны прыз «Крыштальны глобус» за ўнёсак у сусветны кінематограф атрымаў галівудскі акцёр Цім Робінс. У асноўным конкурсе за прыз «Крыштальны глобус» спаборнічаюць 12 кінастужак, сярод якіх і работа расійскага рэжысёра Івана Твярдоўскага «Падкіды». Беларускае кіно прадстаўлена ў другой па значэнні конкурснай праграме «На Усход ад Захаду», дзе дэманструюць стужкі з краін былога СССР, Грэцыі і Блізкага Усходу. Сярод 12 карцін (з іх 8 — сусветныя прэм'еры) фільм нашай суайчыннікі Дар'і Жук «Крышталь», дзе ідзе расповед пра жыццё студэнткі юрфака, якая хоча пабудаваць кар'еру дыджэя ў Амерыцы. Цырымонія ўзнагароджання пераможцаў міжнароднага кінафестывалю ў Карлавых Варах адбудзецца 7 ліпеня.

Зорка фільма «Чалавек-мураш» галівудскі акцёр Пол Рад распавёў у адным з інтэрв'ю пра сваё беларускае паходжанне. Акцёр паведаміў журналістам, што браў удзел у адмысловым тэлешоу, дзе дапамагаюць адшукаць свае карані. Высветлілася, што сапраўднае прозвішча яго бацькі — Рудніцкі, а бабуля і дзядуля галівудскага артыста жылі ў вёсцы Холмеч Гомельскай вобласці Беларусі. Сярод дакументаў знайшліся нават звесткі пра тое, як яго прадзеда выклікалі на службу ў рускую армію 1 лістапада 1895 года. Пол Рад не адзіная галівудская знакамітасць, чые продкі паходзяць з Беларусі: беларускія карані знайшліся ў Скарлет Ёхансан, Вайноны Райдэр, Лізы Кудрау, Майкла Дугласа, Гвінет Пэлтрау, Стыва і Ліў Тайлераў, Харысана Форда ды інш. На гэтыя абставіны звярнула ўвагу кампанія *Mark Formelle*: брэнд распрацаваў эксклюзіўную калекцыю цішотак, якую даслалі ў падарунак замежным зоркам, што маюць дачыненне да Беларусі.

Здапамогай мабільнага дадатку вырашылі праблему з надта вялікім патокам турыстаў у Лондане. Сталіцы Вялікабрытаніі апошнім часам стала цяжка прымаць безліч гасцей, якія імкнуцца прайсціся па самых папулярных маршрутах горада. Гульня «*Play London With Mr. Bean*», створаная дзеля таго, каб «разгрузіць» цэнтр Лондана, прапануе турыстам узяць удзел у адмысловым квэсце ў абмен на зніжкі. Карыстальнікі электроннага дадатку на сваіх гаджэтах павінны выконваць заданні, сутнасць якіх у тым, каб наведваць славутасці за межамі Лондана. Віртуальныя балы, атрыманыя ў дадатку, можна памяняць на рэальныя зніжкі ва ўстановах горада.

На Алеі славы Галівуду, якая знаходзіцца ў Лос-Анджэлесе, хутка з'явяцца новыя імёны. Гэтым разам адборачны камітэт Гандлёвай палаты Галівуду, які займаецца прысуджэннем узнагароды, вырашыў адкрыць у 2019 годзе адмысловыя зоркі з імёнамі амерыканскага акцёра Роберта Дэ Ніра і мексіканскага рэжысёра Гільерма дэль Тора. Прэтэндуюць на зорку і акцёры Дэніэл Крэйг, Эн Хэтэўэй, Лупіту Ніёнга, Алан Аркін, Крыстэн Бэл, Люсі Лью, Тэрэнс Ховард і Мэндзі Мур, спевакі Майкл Бубла, Пінк і Фэйт Хіл. Узнагарода вельмі прэстыжная, але ўжо досыць папулярная: цяпер на Алеі славы больш як 2,6 тысячы імянных зорак!

Агляд цікавінак ад Дар'і ЧАРНЯЎСКАЙ

Землякі

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ

СІЛАЙ ВЫСОКАЙ ЛЮБОВІ

Быў час, калі даводзілася, вандруючы па журналісцкіх справах па Дзісеншчыне, завітаць у прыгожае мястэчка Германавічы, дзе працавала ў школе Ада Эльеўна Райчонак.

Сёння пра Аду Эльеўну могуць распавесці шмат хто з мастакоў, краязнаўцаў, проста шчырых аматараў гісторыі роднага краю, а некалі нікому раней не вядомая сельская настаўніца разам са сваім калегам Кліменцієм Кожанам распачынала вяртанне спадчыны Язэпа Драздовіча, стварыўшы ў школе музей «вечнага вандроўніка», як назваў яго крыху пазней выдатны навуковец Арсень Ліс.

Калі пасля майго пераезду ў Мінск адзін добры паэт і харошы таварыш папрасіў павазіць яго па Віцебшчыне, адным са слаўных месцаў, куды я яго прывёз, былі менавіта Германавічы. Памятаю натруджаныя сялянскія рукі настаўніцы, якія абіралі бульбу, шчырую і адкрытую ўсмешку яе мужа Алега Райчонка, які памяняў пасаду старшыні калгаса на нялёгкую фізічную працу ва ўласнай фермерскай гаспадарцы, і сарамлівага, ціхага юнака Міхася, так падобнага на маці.

Міша Райчонак. Праз некаторы час ён прынясе мне ў «Вожык» паказаць свае першыя апавяданні, раскажа пра планы напісання гісторыі родных мясцін…

Хто мог падумаць, што яго жыццё так рана абарвецца… Яшчэ падчас вучобы ў школе ён арганізаваў гурток, дзе яны з сябрамі збіралі звесткі аб славутых земляках, праводзілі раскопкі на месцах баёў у часы Вялікай Айчыннай вайны. Скончыўшы філалагічны факультэт Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта, Міхась паступіў у аспірантуру пры Інстытуце літаратуры Акадэміі навук, вярнуўшыся ў Германавічы, працаваў у музеі, з яго ўдзелам былі праведзены першыя Дзісенскія чытанні, краязнаўчы маладзёжны фэст, конкурс дзіцячых малюнкаў «Шляхамі Язэпа Драздовіча», тры рэспубліканскія пленэры, прысвечаныя знакамітаму земляку. Пасля яго засталася кніга «Як сын твой родны», дзе змешчаны мастацкія творы таленавітага паэта і пісьменніка. Міхася не стала, калі яму было дваццаць сем гадоў.

Як гэта было перажыць маці, для якой Міхась быў пяшчотным улюбёнцам?.. А ў яе жыцці трагічных момантаў хапала. Будучы маленькай дзяўчынкай, двойчы трапляла ў гета, але людзі, простыя беларусы, дапамаглі выратавацца.

Дарэчы, Ада Эльеўна спрычынілася да таго, што ў раёне быў устаноўлены памятны знак ураджэнцу гэтых мясцін вядомаму грамадскаму дзеячу і мовазнаўцу Эліэзэру Бэн Егуду, які адрадзіў старажытную яўрэйскую мову іўрыт.

Але галоўны клопат, галоўная любоў Ады Эльеўны — беларуская мова, беларуская культура. Гэтая нястомная жанчына, якой нядаўна споўнілася восемдзесят гадоў, узначальвае Культурна-асветніцкі цэнтр імя Язэпа Драздовіча. На рахунку гэтага цэнтра — мастацкія пленэры, прысвечаныя знакамітым землякам Язэпу Драздовічу, Васілю Быкаву, Рыгору Барадуліну, Уладзіміру Караткевічу. У адным з такіх пленэраў браў удзел і Рыгор Барадулін. Мастакі тады жылі ў Бычках, роднай вёсцы Васіля Быкава, і прыязджалі ва Ушачы, каб сустрэцца з Рыгорам Іванавічам. Кажуць жа нездарма, што наша родная зямля, яе краявіды, напоўненыя і настоеныя на гісторыі, традыцях, на цудоўных песнях, казках, паданнях, даюць надзвычайную сілу духу, пачуццё любові і прыналежнасці да роднага краю…

Паэт, якога хочацца зразумець больш глыбока: яго вершы западаюць у душу, яго словы актуальныя дагэтуль. А ў яго біяграфіі застаецца шмат таямніц, шмат пытанняў, дакладных адказаў на якія гісторыя пакуль не дала. Таму кожны зварот да асобы Янкі Купалы — у кнігах, тэатральных пастаноўках, дакументальных кінапраектах — прыцягвае. І прымушае думаць пра тое, што было каштоўным для Купалы, як шануем яго каштоўнасці мы? І пра тое, якога шанавання сёння варты ён?..

У палоне міфа

Трэба хваліць.
Асабліва калі сваё.
Асабліва калі рабілі твае знаёмыя.

А тым больш на беларускай мове, якая гучыць не абы-дзе, а на сцэне Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра.

Менавіта з такімі светлымі думкамі я вяртаўся 28 чэрвеня з прэм'еры музычнага спектакля Алега Хадоскі «Жыццё і смерць Янкі Купалы».

Спатрэбілася некалькі дзён, каб я зразумеў, што ў гэтай пастаноўцы мне спадабалася ўсё.

Цудоўныя галасы, багатая на самыя розныя адценні музыка, неназаляльная ў сваёй сціплай нязмушанасці відэапраекцыя (куды без яе ў сучасным спектаклі?), лаканічная сцэнаграфія, з абавязковым, падвешаным зверху велізарным купальскім вянком (які ў асабліва драматычных момантах ператвараўся ў цярновы), звыкла-статычныя мізансцэны падчас арый, ды загадкавыя танцы масоўкі (асабліва эпізоды з удзелам пацукападобных тайных агентаў, чые імпульсіўныя рухі нагадвалі нейкую істэрычную гімнастыку).

Асабліва кранала сама драматургія.

Насуперак меркаванням многіх літаратуразнаўцаў, аўтары (Анатоль Дзялендзік, Анатоль Зэкаў, Алег Хадоска) з камсамольскай упэўненасцю пакідаюць у аснове свайго лібрэта даўні, кананічны міф пра тое, што сапраўдным каханнем Янкі Купалы была Паўліна Мядзёлка.

О, так! Не верыце ў існаванне такога адзінага і непаўторнага рамана? Атруціліся скепсісам Георгія Коласа, прачытаўшы яго кнігу «Карані міфаў»? Тады майце ў сабе смеласць забыць гэтае няправільнае выданне. Выкіньце з галавы як страшны сон і лепей перачытайце ўспаміны самой Мядзёлкі «Сцежкамі жыцця» (яны сталі драматургічным каркасам п'есы).

Паверце ў існаванне падобных «сцежак» так жа, як гэта зрабілі аўтары лібрэта (бо калі атрымалася ў іх, то няўжо не атрымаецца ў вас?), пастаўцеся да напісанага Мядзёлкай з той дзіцячай адкрытасцю верніка, які гартае Святое Пісанне, і тады нават думкі не дапусціце, што малады паэт мог мець раман з юнай Канстанцыяй Буйло (яны правялі рамантычную ноч у рэдакцыі «Нашай нівы», і ў далейшым Купала спрыяў яе творчасці), не будзеце фантазіраваць пра больш познія рамантычныя прыгоды нашага песняра, калі ён у канцы 30-х прыязджаў у адзін з грузінскіх санаторыяў, дзе яго з нецярпеннем чакала каханая доктарка.

Не, не і не.

Музай Янкі Купалы была, ёсць і будзе толькі адна Мядзёлка, а ўсё астатняе хай лепей патоне ў тумане мінуўшчыны.

Але стваральнікі спектакля не проста пераказваюць вядомую, яшчэ са школьнай парты, гісторыю кахання Янкі і Паўлінкі. Такой прадказальнай банальнасці вы не знойдзеце.

Тут падыход творчы.

Нават, не пабаюся гэтага слова, творча-постмадэрновы.

Постмадэрну, як вядома, уласціва цытатнасць.

Калі мы назіраем за любоўным трохкутнікам (Купала — Мядзёлка — Уладзіслава Францаўна), а затым бачым, як Паўлінку (цяжарную!) арыштоўвае ДПУ і ў турме яна губляе дзіця, то не ведаю, як астатнім гледачам, а мне захацелася запляскаць у ладкі і крыкнуць: «Якія ж вы, шаноўныя аўтары лібрэта, малайцы! Як тонка пераасэнсавалі сюжэт славутай кнігі Вольгі Івінскай "У палоне часу" і з якой балетнай лёгкасцю перанеслі на беларускую глебу».

Таму, хто не чытаў кнігу, нагадаю, у чым сутнасць. Вольга Івінская пакахала сусветна вядомага жанатага паэта Барыса Пастарнака, зацяжарыла, была арыштаваная савецкімі спецслужбамі, якія хацелі выкарыстаць Івінскую супраць каханка, і падчас зняволення ў яе адбыўся выкідыш.

У спектаклі Хадоскі сюжэт той жа. Чым не прычына палюбіць гэты багаты на алюзіі і творчыя сюжэтныя пераасэнсаванні спектакль з яшчэ большай сілай?

Ізноў жа трэба адзначыць тонкі густ аўтараў «Жыцця і смерці...». Акрамя згаданага моманту, падобнай постмадэрновай цытатнасцю яны не злоўжываюць (ну мо яшчэ ў фінале, гэтак жа, як і ў «Песняры» Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Горкага, завяршаюць свой спектакль Купалаўскай «Малітвай»).

Стваральнікі памятаюць, ДЛЯ КАГО яны робяць гісторыю пра Янку Купалу.

Безумоўна, не для сённяшняй цынічнай моладзі, школьнікаў ці замежнікаў (гэтая пастаноўка падкрэслена нефестывальная).

Асноўны глядач «Жыцця і смерці Янкі Купалы» — старэйшае пакаленне. Тая шаноўная публіка, якая памятае эстрадны меладызм 70-х (гэтым рэтрацудам Алег Хадоска насычае свае дзівосныя арыі напоўніцу), хто любіць тонкую эстэтыку класічнага серыяла «Проста Марыя» і для каго немалаважнае значэнне мае знешні выгляд галоўнага героя. А Янка Купала на працягу ўсяго двухактовага дзейства глядзіцца не горш, чым на карцінах беларускіх савецкіх мастакоў, калі яны таго ж... Янку Купалу малявалі. І як у тэму пад канец спектакля на экране ўзнікае жывапісны вобраз паэта, работы менавіта вядомага майстра іканаграфічных партрэтаў Міхаіла Савіцкага.

Дык вось, пра бездакорны знешні выгляд Янкі Купалы.

Ці перад намі пецярбургская прэм'ера «Паўлінкі», ці сцэна допытаў у ДПУ, ці тонка-філасофскі дыялог паэта з двума Сталінымі (чаму менавіта такую колькасць Язэпаў Вісарыёнавічаў падкінулі Купалу — загадка, бо ў спектаклі гучыць думка, што Сталін паўсюль), ці містычныя эпізоды ў нейкай міжчасавай пасторы, дзе невядомыя інфернальныя героі спяваюць на латыні, — усюды паэт у нязменным выдатна адпрасаваным касцюме, з цудоўна ўкладзенай прычоскай, гаворыць з сябрамі і ворагамі заўсёдна-шыкоўным, добра пастаўленым бадзёрым тэнарам.

І гэта правільна!

Сапраўдны герой (хай хоць Ніягарскі вадаспад на яго абрынецца) павінен выглядаць як Кэры Грант ці Жан Марэ, каб ні валасінкі на ім не варухнулася.

Памятаю, калі ў дзяцінстве глядзеў на канікулах раннія шпіёнскія фільмы Альфрэда Хічкока, то вялікай іх прыхільніцай была і баба Люба.

А чаму?

Ёй падабаўся востры нечаканы сюжэт? Не! Галоўнае было тое, што «герой добра ўвабраны, у *хорошым* піджаку і штанах». Згадзіцеся, як і для хічкокаўскіх стужак, так і для спектакля, прысвечанага Янку Купалу, гэта адзін з асноўных неабходных элементаў пры стварэнні паспяховай гісторыі.

А тое, што падобны спектакль будзе мець поспех, — бясспрэчна.

Бо пра што ставіць рэжысёр Міхаіл Кавальчык? Пра што пісалі Алег Хадоска, Анатоль Дзялендзік і Анатоль Зэкаў лібрэта? Пра «Жыццё і смерць Янкі Купалы»? Падаецца, што не. Гэтай падкрэслена раманснай назве верыць не трэба.

Адказ — у эстэтыцы спектакля.

Рэжысёр і пералічаныя драматургі заклікаюць: беражыце ўласныя міфы, не чапайце іх, не рушце! Стварайце не новую сумнеўную, няхай і заснаваную на праўдзівых фактах, гісторыю, а ўпрыгожце даўно вядомы канон ледзь заўважнымі штрыхамі. Не забывайце: беларусы ў сваёй аснове не любяць наватарства, яны страшныя кансерватары. А таму не трэба іх расчароўваць.

Хіба не дэманструюць, дзякуючы падобным заклікам, аўтары спектакля сваё тонкае і такое кранальнае адчуванне беларускай душы?

А таму трэба хваліць.
Асабліва калі сваё.
Асабліва калі рабілі твае знаёмыя.

А тым больш на беларускай мове. І не абы-дзе гучыць гэтая мова, а на сцэне Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра.

Публіка прымала «Жыццё і смерць Янкі Купалы» стоячы.

Васіль ДРАНЬКО-МАЙСЮК

БЕЛАРУСЬ У МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ: ПОГЛЯД У БУДУЧЫНЮ

За чвэрць стагоддзя беларуская літаратура значна ўзбагацілася, з'явіліся новыя тэмы і аспекты ў асэнсаванні радзімы. Таму наспела неабходнасць абмеркаваць асноўныя дасягненні прыгожага пісьменства ў адлюстраванні жыцця краіны, а таксама асэнсаваць перспектывы далейшага развіцця мастацкай літаратуры суверэннай Рэспублікі Беларусь. З гэтай мэтай у Інстытуце літаратуразнаўства імя Янкі Купалы адбыўся рэспубліканскі круглы стол «Адлюстраванне сучаснай Беларусі ў мастацкай літаратуры». Былі заяўленыя наступныя тэматычныя кірункі работы круглага стала: чалавек і час у сучаснай літаратуры Беларусі, родны кут у творчасці сучасных беларускіх пісьменнікаў, экалагічная і ваенная праблематыка беларускай літаратуры трэцяга тысячагоддзя, развіццё нацыянальнай літаратуры ў кантэксце сусветнай глабалізацыі, сацыяльная адказнасць і выхаваўчае значэнне мастацкай літаратуры канца XX — пачатку XXI стст.

Каб забяспечыць усебаковае, шырокае абмеркаванне акрэсленых тэм, да ўдзелу былі запрошаныя не толькі навукоўцы, але і пісьменнікі, прадстаўнікі рэдакцый.

Дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы, доктар філалагічных навук, прафесар **Іван Саверчанка** коратка расказаў аб працы інстытута, рэалізаваныя ім буйныя праекты і прадставіў удзельнікаў круглага стала.

Урачыстае адкрыццё адбылося пры ўдзеле старшыні Прэзідыума НАН Беларусі, акадэміка НАН Беларусі, доктара эканамічных навук, прафесара Уладзіміра Гусакова; акадэміка-сакратара аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі, доктара гістарычных навук, члена-карэспандэнта НАН Беларусі, прафесара Аляксандра Кавалені; дырэктара Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, акадэміка НАН Беларусі, доктара гістарычных навук, доктара архітэктуры, прафесара Аляксандра Лакоткі.

Выступоўцы адзначылі эфектыўнасць працы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, а таксама актуальнасць і надзённасць узнятай тэмы. Найноўшая гісторыя Беларусі вартая мастацкага асэнсавання, і менавіта майстры слова могуць паспрыяць кансалідацыі грамадства, выхаванню патрыятычных пачуццяў, эстэтычнага густу. Было падкрэслена таксама, што ў акадэмічным асяродку хапае інтэлектуальнага рэсурсу для ўдумлівага крытычнага погляду на літаратуру і мастацтва ў цэлым, акрэслення шляхоў іх развіцця.

Свае меркаванні выказалі таксама пісьменнікі і грамадскія дзеячы Міхаіл Пазнякоў, Георгій Марчук, Віктар Праўдзін, Васіль Шырко, Аляксандр Бадак, Зоя Падліпская, Валерый Гапееў, Аляксандр Кавалёнак.

Старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі **Міхась Пазнякоў** выступіў з паведамленнем «Родны кут у творчасці сучасных беларускіх пісьменнікаў». «Як вучоных-гуманітарыяў, так і пісьменнікаў не можа не хваляваць сёння пытанне фарміравання нацыянальнай свядомасці грамадзян нашай краіны, любові да сваёй Айчыны, пашаны да нашай гістарычнай памяці. І перш за ўсё данесці гэта можа наша мастацтва, тое, што вызначае нас на прасторах Сусвету, тое, чым мы цікавыя і адметныя, тое, што з'яўляецца галоўным складнікам нацыянальнага духу», — мяркуе пісьменнік. М. Пазнякоў падкрэсліў, што літаратура заўсёды імкнулася акрэсліць перспектывы развіцця грамадства. Сёння перад ёй стаяць глыбінныя пытанні і праблемы. Адна з найбольш балючых для беларусаў — праблема роднай мовы, яе недастатковае шырокага выкарыстання. Са свайго боку Саюз пісьменнікаў Беларусі імкнецца выправіць сітуацыю, ладзіць сустрэчы з чытачамі ва ўсіх рэгіёнах краіны. У Год малой радзімы асабліва востра ўспрымаецца праблема вёсак, якія вымираюць, таму М. Пазнякоў з любоўю ўвекавечыў свае родныя мясціны, вёску Заброддзе у аднайменнай кнізе, якую прадставіў прысутным.

Пісьменнік **Георгій Марчук** выказаў занепакоенасць тым, што культура недастаткова прадстаўлена на айчынным тэлебачанні, між тым яно дзякуючы выхаду на самую шырокую аўдыторыю дае багатыя рэсурсы для папулярызацыі літаратуры. Таксама вялікую ўвагу ў сваім выступленні Г. Марчук удзяліў патрыятызму як найважнейшай частцы нацыянальнай ідэалогіі. На думку пісьменніка, сёння калегі-літаратары мусяць працаваць з актуальным жыццёвым матэрыялам, асэнсоўваць праблемы і набыткі сучаснасці. «Задача інтэлігенцыі — утрымаць беларускасць і духоўнасць», — рэзюмаваў Г. Марчук.



Празаіка **Віктара Праўдзіна** як аўтара і грамадзяніна натхняюць пазітыўныя зрухі ў сельскай гаспадарцы, прыклады паспяховай стваральнай працы, якія варта фіксаваць літаратуры. Аднак актуальнай праблемай бачыцца пэўная замкнёнасць літаратурнай супольнасці: не заўсёды плён працы выходзіць на шырокую аўдыторыю.

Публіцыст **Васіль Шырко** таксама закранаў тэму вёскі і грунтаваўся на ўласных успамінах і назіраннях са шматлікіх паездак па раёнах Беларусі. В. Шырко акрэсліў праблемы і перспектывы сельскай гаспадаркі, станоўчыя і адмоўныя моманты. Сваё лірычнае, пяшчотнае стаўленне да вёскі публіцыст выказаў цытатай з Алеся Пісьмянкова: «У мяне не настальгія / — проста сум па чысціні». Пісьменнік мусіць быць скіраваны ў сваёй творчасці да сучаснасці і да будучыні, зазначыў В. Шырко ў падсумаванне.

Змястоўным было выступленне пісьменніка **Алеся Бадака**, дырэктара выдавецтва «Мастацкая літаратура». Аналізуючы беларускую літаратуру ад 1970-х і да сучаснасці, ён прыйшоў да высновы, што найлепшыя творы Івана Мележа, Васіля Быкава, Уладзіміра Караткевіча, Івана Навуменкі, Вячаслава Адамчыка, Андрэя Федарэнкі і Алеся Наварыча былі напісаныя з пэўнай адлегласці, калі прайшоў час, каб асэнсаваць вызначальныя гістарычныя падзеі. Як і іншыя выступоўцы, А. Бадак адзначыў страту цікавасці да літаратуры: «Старыя формы, метады прапаганды літаратуры сёння не дзейнічаюць». Таму стаіць задача адаптавацца да свайго часу, шукаць эфектыўныя шляхі рэкламаваць прыгожае пісьменства.

Галоўны рэдактар часопіса «Роднае слова» **Зоя Падліпская** ў сваім выступленні засяродзіла ўвагу на выхаваўчым значэнні беларускай літаратуры канца XX — пачатку XXI стст., падмацоўваючы тэзісы найлепшымі ўзорамі беларускай паэзіі. «Шчырасць, духоўнасць паэтычных твораў здольныя ўплываць на свядомасць чалавека, а значыць, перайначваць яго да лепшага, а значыць, перайначваць да лепшага і той час, у які мы жывём», — перакананая З. Падліпская. Выступоўца спаслалася на метадычныя напрацоўкі Міхаіла Лазарука, згодна з якімі літаратура — той школьны прадмет, які дае магчымасць шматбаковага духоўнага ўзбагачэння асобы, дазваляе школьнікам спазнаць рэчаіснасць, адшукаць сваё месца ў жыцці. Зыходзячы з гэтых меркаванняў, часопіс «Роднае слова» дапамагае сваім чытачам спасцігнуць родную літаратуру.

Валерый Гапееў, адказны сакратар газеты «Івацэвіцкі веснік», пісьменнік і журналіст, выказаў думку, што літаратару неабходная творчая свабода: «Культура сама па сабе нікому нічога не павінна. Літаратура як частка культуры таксама нікому нічога не павінна. Пісьменнік нікому нічога не павінны. Ён проста павінны быць, як павінна быць культура. Нельга кіраваць культурай». Разам з тым ён падкрэсліў, што пісаць пра сучаснасць — значыць браць на сябе вялікую адказнасць, трэба дасканала ведаць рэаліі, а таксама вельмі глыбока, усебакова асэнсоўваць тыя працэсы, што адбываюцца ў грамадстве. В. Гапееў выказаў прапанову стымуляваць працу пісьменнікаў стыпендыямі, удзелам у творчых рэзідэнцыях.

Пісьменнік **Аляксандр Кавалёнак** прадставіў дзейнасць літаб'яднання «Пламя», расказаў аб працы з маладымі літаратарамі, а таксама выказаўся пра неабходнасць больш сістэмна рэкламаваць літаратуру.

У цэлым выступоўцы сышліся ў меркаваннях наконт актуальнасці сучаснай тэматыкі, а таксама адносна таго, што істотнай праблемай сёння з'яўляецца недастатковая ўвага да культуры, змяншэнне чытацкай аўдыторыі. Выйсце ўдзельнікам круглага стала бачыцца ў тым, каб пашыраць прадстаўленасць культурнай сферы, і літаратуры ў прыватнасці, у СМІ, у тым ліку на тэлебачанні і ў інтэрнэце; заахвочваць працу пісьменнікаў.

Алена КАРП

Інтэлект як унёсак

Вартымі сваіх выбітных папярэднікаў — асветнікаў, даследчыкаў і філосафаў мінулых стагоддзяў былі і тыя айчынныя навукоўцы, якія стаялі ля вытокаў стварэння першай навучальнай установы нашай краіны — Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Пад вокладкай кнігі «Інтэлектуальная эліта Беларусі. Заснавальнікі беларускай навукі і вышэйшай адукацыі (1919—1941)» (Мінск: БДУ, 2017) сабраны біяграфіі 27 універсітэцкіх інтэлектуалаў — арганізатараў і першых прафесараў БДУ. Гэта першае выданне ў серыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт: 100 гадоў на карысць Айчыны».

Праз жыццеапісанні і творчыя біяграфіі выбітных даследчыкаў БДУ першых дваццаці гадоў яго дзейнасці паказана вялікае значэнне навукі і вышэйшай адукацыі ў будаўніцтве нацыянальнай беларускай дзяржавы, яе палітычных, эканамічных і культурных падмуркаў.

Працу па стварэнні выдання пачаў Алег Яноўскі. Першапачатковая задума была распавесці пра першых навукоўцаў, якія працавалі менавіта падчас станаўлення БДУ. Ідэю падтрымаў рэктар БДУ Сяргей Абламейка. Вынікам карпатлівай даследчыцкай працы стаў том, у якім змешчана шмат матэрыялаў з дзяржаўных, ведамасных, занальных і прыватных архіваў не толькі Беларусі, але і Расіі, Літвы, Украіны. Некаторыя даведкі атрыманы з архіва Камітэта дзяржбяспекі. Многія матэрыялы ўпершыню ўводзяцца ў навуковы ўжытак. Падчас працы атрымлівалася знайсці нашчадкаў некаторых вучоных — яны дапамаглі са зборам інфармацыі.

Артыкулы распавядаюць пра асоб, чые лёсы звязаныя з БДУ, якія зрабілі значны ўнёсак не толькі ў станаўленне навукі, але і паўплывалі на стварэнне некаторых даследчыцкіх школ. Гісторыкі Уладзімір Пічэта, Мітрафан Доўнар-Запольскі, Усевалад Ігнатоўскі, Мікалай Нікольскі, Уладзімір Перцаў, заснавальнік беларускай тэксталогіі Іван Замоцін, аўтар адной з першых граматык Язэп Лёсік, лінгвіст Сцяпан Некрашэвіч, заснавальнік айчыннай геаграфіі Аркадзь Смоліч... Гэтыя імёны павінен ведаць кожны беларус!

Адметна, што ўсю працу па падрыхтоўцы выдання да друку зрабілі выкладчыкі гістарычнага факультэта БДУ. Гісторыкі імкнуліся строга прытрымлівацца фактаў і логікі дакументаў, але ў той жа час пісаць папулярна. Цяпер яны рыхтуюць да выдання другую кнігу серыі. Плануецца, што яна пабачыць свет ужо сёлета.

Яна БУДОВІЧ

Асветнікі зямлі беларускай

Выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» парадавала працягам заснаванай пазалетась серыі «Асветнікі Беларусі». Напрыканцы мінулага года і сёлета пабачылі свет выданні, прысвечаныя пісьменнікам: «Ян Баршчэўскі. Ян Чачот. Ігнат Дамейка, 2017» і «Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. Уладзіслаў Сыракомля. Вінцэсь Каратынскі, 2018». А кніга «Іван Фёдараў. Пётр Мсціславец. Спірыдон Собаль, 2018» распавядае аб прадаўжальніках справы Францыска Скарыны. Аўтар выданняў — гісторык і культуролаг Эдуард Дубянецкі — жывой і зразумелай мовай, папулярна і захапляльна распавядае пра жыццё, творчасць, адкрыцці і дасягненні дзеячаў нашай гісторыі. У тэкстах згадваюцца факты іх біяграфій, цытаты з твораў. Адметна, што аўтар раскрыў сваіх герояў не проста як гістарычных дзеячаў, але злучыў тыя далёкія часіны з сучаснасцю, паказаў, як шануецца памяць пра іх у нашы дні.

Выдатнымі атрымаліся ілюстрацыі. Мастак працаваў поруч з аўтарам: кожны крок, паварот, калізія ў жыццеапісаннях маюць непасрэднае пацвярджэнне ў выглядзе карцін, фотаздымкаў, партрэтаў, выяваў архітэктурных збудаванняў, старажытных выданняў, рукапісаў, гравюр, літаграфій, гербаў шляхецкіх родаў, схем і планаў гарадоў.

А цяпер уважліва прыгледземся да кожнай са знакамітых асоб.

Фота Яны Будовіч.

Іван Фёдараў (каля 1510—1583)

Нягледзячы на тое, што І. Фёдараў — заснавальнік кнігадрукавання ў Расіі і Украіне, значны адрэзак жыцця асветнік пражыў на тэрыторыі этнічнай Беларусі. Э. Дубянецкі прыводзіць версію беларускага паходжання Івана Фёдарава ад старажытнага шляхецкага роду Рагозаў, які меў фамільны герб «Шранява». Справа ў тым, што герб Івана Фёдарава на Новым Запавеце мае падобную выяву. Гэта, а таксама запіс 1529 года ў кракаўскай кнізе ўліку студэнтаў, дзе месцам нараджэння значацца Піткавічы (а ў Беларусі не адна вёска з такой назвай) і служыць на карысць згаданай гіпотэзе. Аўтар паказаў, у якіх стасунках і ўмовах І. Фёдараў выдаваў кнігі, — спачатку ў Маскве (што адбылося амаль на паўстагоддзя пазней, чым гэта зрабіў Ф. Скарына ў Празе), а пасля і на тэрыторыі сучаснай Польшчы, якая на той момант уваходзіла ў склад Вялікага Княства Літоўскага. Згадваецца і пра знаёмства Івана Фёдарава з іншым беларускім асветнікам — Сымонам Будным. Адметны «старадрукарскі» стыль, створаны ў тандэме з Пятром Мсціслаўцам, а таксама новыя тэхнікі гравюр і прыёму друку тэксту ў двух колерах — наватарства ў кнігавыдавецкай дзейнасці таго часу, пра што і засведчыў у сваім расповедзе Э. Дубянецкі. З-за чаго расійскія першадрукары вымушаны былі пакінуць межы Маскоўскай дзяржавы і шукаць прытулку ў суседзяў — ні гэтыя, ні іншыя жыццёвыя рэаліі не засталіся па-за ўвагай аўтара.

Пётр Мсціславец (каля 1520-х гадоў — пасля 1577 года)

Менавіта гэты слаўны сын беларускай зямлі адрадзіў і працягнуў справу нашага славутага першадрукара Францыска Скарыны, узбагаціў закладзеныя ім традыцыі кнігадрукавання. Нягледзячы на тое, што пра жыццё П. Мсціслаўца захавалася зусім няшмат звестак, расповед пра яго атрымаўся насычаны і цікавы. Адметна, што Э. Дубянецкі, прыводзячы версіі даследчыкаў жыцця П. Мсціслаўца, не выказвае сваёй пазіцыі: чытач сам павінен скласці меркаванне, улічыўшы ўсе аргументы. Кнігавыдавецкая дзейнасць Пятра Мсціслаўца ў Вільні ў адкрытай ім друкарні пры падтрымцы братоў Мамонічаў — яркія, а ў нечым драматычныя старонкі расповеду.

Спірыдон Собаль (каля 1590-х гадоў — каля 1645 года)

Шматгранная і самаахвярная асоба, жыццё якой было прысвечана пашырэнню асветы і развіццю айчыннага кнігадрукавання — такім застаўся ў гісторыі Спірыдон Собаль. Хоць пра жыццё яго звестак амаль няма, засталося багата сведчанняў пра яго падзвіжніцкую дзейнасць, асабліва пра два апошнія дзесяцігоддзі. Верагоднае месца навучання Спірыдона Собаля, праца, пасады, спасціжэнне асноў друкарскай справы, пераезд ва Украіну і адкрыццё друкарні, першыя друкаваныя кнігі, вяртанне ў родныя мясціны, удзел у заснаванні Куцеінскай друкарні і вельмі высокі паліграфічны ўзровень яе выданняў... Чытач не зможа адкласці кнігі, пакуль пра ўсё не даведаецца.

Ян Баршчэўскі (каля 1794—1851)

Менавіта ён — першы творца ў гісторыі айчыннай літаратуры, хто стаў пісаць вершы на беларускай мове, а таксама лічыцца стваральнікам фантастычнага жанру.

Вучоба, падарожжы па родным краі і апісанні падчас іх курганоў і гарадзішчаў, захапленне фальклорам — усё гэта сфарміравала светапогляд маладога пісьменніка. Пасля — жыццё, праца і вучоба ў Санкт-Пецярбургу, служба ў мясцовым марскім ведамстве і далёкія падарожжы, знаёмства з Адамам Міцкевічам і Тарасам Шаўчэнкам, стварэнне літаратурнага асяродка, выданне ўласных твораў — пра ўсё з захапленнем, як пра ўласнага сябра, распавядае Э. Дубянецкі. Ён прыводзіць і драматычны факт, звязаны з творчасцю Яна Баршчэўскага: таленавіты малады беларускі паэт Паўлюк Багрым быў абвінавачаны ў чытанні і перапісванні верша «Бунт хлопаў», што па цэнзурных прычынах распаўсюджваўся ў рукапісах. Верш належаў пяру Баршчэўскага. Аўтар дае характарыстыку творчаму метаду Яна Баршчэўскага, распавядае, як быў сустрэты чытачамі галоўны яго твор — «Шляхціц Завальня».

Ян Чачот (каля 1794—1851)

лічыцца, як і Ян Баршчэўскі, родапачынальнікам новай беларускай літаратуры. З маленства далучаны да прыгажосці роднага слова праз казкі, спевы, легенды і паданні, Ян Чачот стаў сапраўдным патрыётам сваёй зямлі. Адзін з самых актыўных удзельнікаў тайнага таварыства філаматаў, сябар, дарадца і негалосны рэдактар твораў Адама Міцкевіча, аўтар многіх песен, якія спявалі студэнты на сваіх урачыстасцях. Калі ў 1823 годзе таемныя студэнцкія аб'яднанні былі выкрыты, Ян Чачот, жадаючы адвесці пагрозу расправы над паплечнікамі і аднадумцамі, усю віну ўзяў на сябе. Са старонак кніг чытач даведаецца, што пісьменнік рабіў падчас ссылкі і пасля яе, а таксама пра тое, што абудзіла яго глыбокую цікавасць да гісторыі роднага краю.

Ігнат Дамейка (1802—1889)

Славуты айчынны асветнік і змагар, Ігнат Дамейка стаў нацыянальным героем Рэспублікі Чылі. Вымушаны быць выгнаннікам сваёй Радзімы, ён прысвяціў жыццё служэнню народу іншай краіны. Як склалася, што малады Ігнат спачатку стаў удзельнікам таемнага студэнцкага таварыства, пасля — удзельнікам паўстання 1830—1831 гадоў і адным з галоўных персанажаў у паэме Адама Міцкевіча «Дзяды»? Чаму ён апынуўся ў Парыжы, а потым — у чылійскім горадзе Какімба? У краіне, якая незадоўга перад прыездам туды Дамейкі набыла незалежнасць, не было навучальных устаноў, а прыродныя багацці ніхто не даследаваў. Дзейнасці няўрымслівага даследчыка па арганізацыі і мясцовай сістэмы адукацыі, а таксама сістэмы распрацоўкі і вывучэння прыродных выкапняў хапіла б не на адно жыццё… Расповед Э. Дубянецкага пра нялёгкі і пакручасты лёс нашага знанага земляка выклікае шчыры гонар і захапленне гэтай неардынарнай асобай.

Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч (1808—1884)

Каб расказаць пра жыццё і дзейнасць стваральніка першага беларускага тэатра, Э. Дубянецкі звярнуўся да найноўшых даследаванняў яго творчасці. Адзначыў дзейнасць пісьменніка і як перакладчыка, паказаў паходжанне прыдомка Дунін да прозвішча Марцінкевіч, спыніўся на лёсе яго надзвычай таленавітай дачкі Камілы, якая таксама спачувала паўстанцам і пэўны час знаходзілася, як і бацька, у турме, а потым была ў ссылцы на Урале. Адметна, што ўмовы, у якіх тварыў В. Дунін-Марцінкевіч, былі надзвычай неспрыяльныя для нацыянальнай культуры — так, цэнзура забараніла і амаль цалкам знішчыла зроблены ім пераклад «Пана Тадэвуша». Чытач даведаецца шмат новага са старонак расповеду Э. Дубянецкага.

Уладзіслаў Сыракомля (1823—1862)

Не менш цікавы матэрыял і пра гэтага самабытнага і таленавітага творцу. Аўтар тлумачыць значэнне этнонімаў, якія ўжываліся ў дачыненні да нашых даўніх продкаў: «ліцвіны» і «беларусцы», распавядае пра сямейную трагедыю паэта, пра сяброўства з іншым выбітным творцам — Вінцэсем Каратынскім. Аўтар не абмінуў і той цікавы факт, што папулярная ў Расіі песня, якая лічыцца народнай, — «Ямшчык» — належыць пяру У. Сыракомлі. Адвольна перастворaная па-руску паэтам Леанідам Трэфалевым, яна і загучала як песня.

Вінцэсь Каратынскі (1831—1891)

Лёс гэтага вядомага пісьменніка і журналіста — адзін з самых унікальных у гісторыі беларускай літаратуры XIX стагоддзя. Справа ў тым, што ён нарадзіўся ў сям'і прыгоннага селяніна, але, дзякуючы таленту і імкненню да ведаў, знайшоў свой адметны шлях. І не толькі ў беларускім прыгожым пісьменстве, але і ў польскіх перыядычных выданнях змог стаць запатрабаваным журналістам.

Серыя «Асветнікі Беларусі» вельмі патрэбная сучаснаму чытачу. Для школьнікаў расповеды з кніг стануць добрым дадаткам да падручнікаў па літаратуры і гісторыі (якраз гісторыя цікавей і хутчэй засвойваецца не праз сухія выкладкі, а праз лёсы людзей, якія ў ёй праявіліся). Асобы выбітных суайчыннікаў будуць добрым прыкладам служэння на карысць народа. Але не толькі навучэнцам цікава даведацца пра вялікія здзяйсненні мінулага — усе, хто цікавіцца гісторыяй і культурай сваёй Радзімы, атрымаюць шмат станоўчых эмоцый падчас чытання кніг згаданай серыі.

Яна БУДОВІЧ

ПАЙСЦІ І ВЯРНУЦЦА

Чытаючы дзённікі Ігара Дзядкова

Калі ў 1980 годзе пабачыла свет кніга Ігара Дзядкова «Васіль Быкаў: Нарыс творчасці» (на той час ужо вядомы літаратурны крытык жыў у Кастраме, працаваў у абласной газеце намеснікам галоўнага рэдактара), рэцэнзіямі на гэтую мудрую і надзвычай патрэбную і для Васіля Быкава, і ўвогуле для ваеннай прозы кнігу адгукнуліся «Дружба народов», «Неман» (тады часопіс яшчэ не меў у назве літару «Ё»), «Вопросы литературы», «В мире книг», «Новый мир», «Литературная газета». Кнігу заўважылі, пра яе шмат гаварылі.



Фота Яўгена Кохтыша (здымак з архіва «ЛіМа»).

Алесь Адамовіч і Васіль Быкаў. Сярэдзіна 1970-х гадоў.

Як усё пачыналася?.. Давайце зазірнём у дзённікі крытыка. Яны надрукаваны ўжо пасля смерці літаратара — у 2005 годзе. Асобнай кнігай — у маскоўскім выдавецтве «Прогресс — Плеяда». Чытаем запіс ад 12 ліпеня 1977 года: «Усё б'юся над пачаткам (пра Быкава) і ўсё чытаю ("вакол" Быкава), і пакутую і буду пакутаваць, пакуль усё не пойдзе, як след…» У 1977—1978 гг. Ігар Дзядкоў працуе над кнігай пра беларускага пісьменніка для выдавецтва «Советский писатель». На той час крытык ужо быў аўтарам артыкулаў пра асобныя аповесці Васіля Быкава: у красавіцкім нумары «Дружбы народов» за 1972 год — «Выбух гранаты на ранішняй зімняй дарозе» — пра аповесць «Дажыць да світання»; у чэрвеньскім нумары «Литературного обозрения» за 1976 год — «Вышэй за лёс» — пра аповесць «Яго батальён»; ізноў у «Литературном обозрении» (снежаньскі нумар за 1978 год) — «Быкаў верны Быкаву» — пра аповесць «Пайсці і не вярнуцца».

У 1977 годзе, 9 снежня, І. Дзядкоў занатоўвае свае ўражанні пасля выступлення ў інстытуце ўдасканальвання настаўнікаў перад дырэктарамі васьмігадовых школ з вобласці і яшчэ некаторымі настаўнікамі. «Калі закончыў, то сталага веку, хмуры чалавек з разумным тварам сказаў: а ўсё ж такі праўда пра вайну яшчэ не напісана, нават Быкавым і Бакланавым, раней, сказаў ён, адлюстроўвалі бадзёрых герояў, якім усё даецца лёгка, цяпер гэтага няма, але ўсё адно галоўнай фігурай застаецца герой, які не ведае сумненняў ці лёгка іх перамагае. Хаця гэтага чалавека дырэктар інстытута стала папраўляць ("Ну, не трусаў жа адлюстроўваць"), я сказаў, што разумею яго, але Талстога, г. зн. аб'ектыўнага пісьменніка, пакуль няма. Пытанне гэтае, ці, дакладней, сама гэтая думка майго слухача мне спадабалася, як і агульныя адносіны да таго, што я гаварыў, у прыватнасці, пра раман Стаднюка "Вайна" і яго імкненне да адбельвання Сталіна…»

Яшчэ ў студзені 1978 г. крытык (запіс ад 14 студзеня) працуе над кнігай. А недзе ў красавіку працу завяршае. Сведчыць пра тое наступны сціслы запіс — ад 19 красавіка: «Даўно я не пісаў. Многае было. Рызыкну нават напісаць, што многае было перажыта. І калі — празмерна доўга — пісаў пра Быкава...»

Да тэмы творчасці беларускага пісьменніка Ігар Дзядкоў вяртаецца ў кастрычніку 1978 г.: «За мінулыя дні напісаў артыкул для "дыялога" з Залатускім пра апошнія аповесці Быкава ("Пайсці і не вярнуцца"). І той артыкул, што напісаў раней, і гэты выйшлі ў мяне празмерна адкрытымі, эмацыйнымі, і цяпер я не ўпэўнены, што лёс іх будзе ўдачлівым…» Але артыкул быў надрукаваны. Гэта ўжо згаданая публікацыя ў «Литературном обозрении» — «Быкаў верны Быкаву». А публікацыя Ігара Залатускага ў тым самым нумары выйшла з наступнай назвай — «Быкаў супраць Быкава».

У красавіку 1979 года Ігар Аляксандравіч наведваецца ў Маскву. Сярод іншых клопатаў — і выдавецкі лёс кнігі пра Быкава. Чытаем у запісе ад 30 красавіка: «Самае важнае і абнадзейваючае ў гэтай паездцы ва ўсёй паездцы — размова ў "Советском писателе" з А. М. Конюхавай і А. І. Ізгародзінай. Заўвагі па рукапісу пра Быкава нязначныя, чацвёртага мая я вышлю яго назад; у маі па плану яна павінна здавацца ў вытворчасць. Бачыў і афармленне кніжкі, якое мне спадабалася. Увогуле, прынялі мяне добра, лепшага і чакаць не трэба, каб толькі ўсё завершылася добра. Будзем спадзявацца».

І вось запіс ад 31 снежня 1979: «Колькі ж дзён прайшло, колькі ўсяго! Пасля апошняга, лістападаўскага, запісу. Хацеў паехаць у Маскву на вечар В. Быкава ў Ленінскай бібліятэцы, ды не паехаў: пісаў прадмову да кніжкі Я. Старшынава, якая ў пачатку васьмідзясятага павінна выйсці ў свет…» 30 верасня 1980 г.: «На вераснёўскі савет па крытыцы я не паехаў. Пішу зараз артыкул пра В. Быкава для "Нашего современника", для нумара недзе ў сакавіку — красавіку, прысвечанага цалкам (г. зн. у асноўнай частцы) гэтаму пісьменніку. І не варта было б, магчыма, ім пісаць з-за некаторых іх публікацый, ды не дзеля іх пішу, дзеля Быкава». 5 кастрычніка — удакладненне: «Пішу пра Быкава для "Нашего современника". Вясной будзе нумар часопіса, дзе яму будзе прысвечаны цэлы блок матэрыялаў: яго аповесць, гутарка з ім, фотаздымкі, падборка чытацкіх лістоў, артыкул пра творчасць. Успамінаю нумар, які быў прысвечаны Васілю Бялову, дзе, у прыватнасці, была дзіўная безгустоўшчына, банальны фотаздымак пад назвай "Роздум". Я яшчэ падумаў: як гэта Бялоў дазволіў і пагадзіўся. Нават праз гэта сказваецца распаўсюджаны зараз узровень пісьменніцкай асобы. Думаю, што Быкаву не варта было пагаджацца на такі "рэкламны" "блок". Вось Залыгін адмовіўся, і Лёня Фралоў гаварыў: "Мы яго яшчэ болей сталі паважаць". "Самі прыдумалі, — сказаў я, — самі правакуеце, а пасля, выходзіць, самі болей паважаеце не тых, хто пагадзіўся, а тых, хто адмовіўся"». 2 лістапада: «Учора адаслаў у "Наш современник" артыкул пра Быкава…»

Анапрыканцы 1980 года выходзіць кніга І. Дзядкова пра Васіля Быкава ў маскоўскім выдавецтве. 4 лютага 1981 г. крытык запісвае ў сваім дзённіку: «Учора вярнуўся з Масквы. Ездзіў на пленум праўлення "Советского писателя". Кніжка мая пра Быкава з'явілася ў Кастраме ў сярэдзіне студзеня: 54 экзэмпляры на ўсю вобласць. Я так і не зразумеў, чаму адна з работніц базы кнігагандлю (дакладней, адна з таваразнаўцаў) вырашыла паведаміць пра тое, што кніга паступіла. Але яна пазваніла, я з'явіўся і забраў 44 кніжкі. Адну падарыў гэтай жанчыне (прозвішча — Грэчына). Пасля я пашкадаваў, што забраў гэтулькі кніг; падумалася, што пазней я ўсё адно гэтулькі б купіў і ў Маскве, а тут атрымалася так, што ў Кастраме кніжка не паступіла практычна зусім. Ды што ўжо зрабіць — не вяртаць жа.

Большую частку кніжак я ўжо адаслаў, раздарыў. Ужо прыйшлі лісты ад Быкава, Лазарава, Пятра Аляксеевіча Мікалаева. Пакуль не сварацца. Даўно нічога няма ад Багамолава...» 14 лютага: «...Няма ліста і ад Адамовіча, хаця Ізгародзіна сказала мне, што ён ужо напісаў рэцэнзію на маю кніжку пра Быкава і ўключыў рэцэнзію у сваю кнігу, якая рыхтуецца ў "Советском писателе"». 15 красавіка: «Былі лісты наконт кнігі ад В. Кандрацьева, Л. Анінскага, М. Скатава, яшчэ ад В. Быкава, ад Л. Грыгар'яна». І праз дзень: «С. Баруздзін даслаў водгук на майго "Быкава". Цікавае сачыненне. Ці надрукуе?». Рэцэнзія Сяргея Баруздзіна — «Калі крытык таленавіты...» — была надрукавана ў часопісе «Дружба народов» у кастрычніцкім нумары за 1982 год. А пазней аўтар змясціў у сваёй кнізе «Пісьменнік. Жыццё. Літаратура» нарыс «Пра Ігара Дзядкова» (Масква, 1985 год).

А Васіль Уладзіміравіч Быкаў пісаў свайму крытыку ў сувязі з выхадам кнігі вось што: «Дарагі Ігар Аляксандравіч, дзякуй Вам. І за ўвагу, за кнігу, за Ваш сумленны розум і гарачае сэрца. Кнігу я злёгку прагледзеў, але буду чытаць уважліва, аднак жа скажу, што згодзен з усім рашуча. Я гэта зразумеў даўно, яшчэ калі прачытаў некалькі Вашых першых рэцэнзій. Вы — рэдкі талент, таму што разумны і не лянівы. І любіце літаратуру. Пра сябе скажу толькі, што я таксама ішоў у ёй з-за любові да яе, ішоў усляпую, але быццам некуды выйшаў, нягледзячы ні на што. Проста хацелася крышачку праўды пасля многіх гадоў напалову-, неда- (праўды), а то і проста хлусні. Сардэчна абдымаю Вас, дарагі мой крытык! Ваш Васіль Быкаў. 30.1.81».

У красавіку 1983 года Ігар Аляксандравіч удзельнічае ў канферэнцыі па ваеннай літаратуры. Тэму арганізатары Дзядковы «падказалі» самі — абазначылі не пытаючыся: «Беларуская ваенная проза вачыма рускага крытыка».

З дзённіка І. Дзядкова ад 17 красавіка: «Ад'езд у Мінск (22.00) разам з Лазаравым і Кандрацьевым». 18 красавіка: «Мінск. Раніца ў Быкава (з 10. 30 да 14. 30) разам з Лазаравым і яго жонкай. Днём прагляд тэлевізійнага фільма "Формула гуманізму". Вечарам — усе разам у Адамовіча». Праз дзень — запіс пра пасяджэнне. «Былі Гранін, Кандрацьеў, Галай, Анфінагенаў, Гусараў, Яроменка, Адамовіч, Быкаў, Гілевіч, Чыгрынаў, Брыль, Ю. Каракін. Маё выступленне ў першай палове дня. Банкет. Няшчасце з Быкавым. Начныя размовы з Ю. Каракіным». Раптоўна захварэў Васіль Уладзіміравіч — і гэта наклала сваю пячатку на мінскую паездку І. Дзядкова.

А канферэнцыя «Літаратура пра вайну і праблемы века», якую арганізавалі Інстытут літаратуры імя Я. Купалы і Саюз пісьменнікаў Беларусі, між тым, працягвалася… 20 красавіка Ігар Аляксандравіч запісвае: «Ранішняе пасяджэнне з выступленнем А. Савіцкага. Адказ Адамовіча...» Неабходна патлумачыць. Алесь Савіцкі выступіў на той канферэнцыі з пазіцыяй, у якой, па яго ж словах, адстойваў «марксісцка-ленінскую метадалогію аналізу вайны». А да пазіцыі дадаў свае нападкі на вядомых ваенных пісьменнікаў за іх «капітулянцтва». Алесь Адамовіч рэзка адрэагаваў на выступленне Алеся Савіцкага, горача абараніў пісьменнікаў, якія паказалі антычалавечую сутнасць вайны.

Ігар Дзядкоў прайшоў па жыцці няпростым шляхам. Нарадзіўся ў 1934 годзе. Закончыў Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт. Патрапіў на працу ў кастрамскую «Северную правду». Не абмежаваўся адной журналісцкай работай. Займаўся літаратурнай крытыкай. Імкнуўся пісаць сумленна, праўдзіва, што і дапамагло яму заваяваць аўтарытэт, павагу і ў чытача, і ў пісьменнікаў. Напісаў кнігі пра творчасць Сяргея Залыгіна, Васіля Быкава (яны выйшлі ў 1980 і 1990 гадах), многія артыкулы, рэцэнзіі прысвяціў прозе Віктара Астаф'ева, Юрыя Трыфанава, Канстанціна Вараб'ёва, Васіля Гросмана… З 1987 года жыў у Маскве і працаваў палітычным аглядальнікам часопіса «Коммунист». Памёр у 1994 годзе.

На старонках дзённіка Ігара Дзядкова — многія згадкі пра яго сяброўства, добрыя стасункі з Алесем Адамовічам, Янкам Брылём, іншымі беларускімі пісьменнікамі.

Мікола БЕРЛЕЖ

Людміла ПАЎЛКАВА-ХЕЙДАРАВА

Ранак на Плошчы Перамогі

На Плошчы Перамогі цішыня.
Не ведае ні сну яна, ні стомы,
імёны незабытых, невядомых
перабірае ў памяці яна.

Я слухаю, як дыхае агонь...
На ўсходзе неба пакрысе залее.
Хаця на золку полымя цьмянее,
але пячэ не меней ад таго.

Прачнуўся сад ля Свіслачы-ракі.
Сюды прыйшоў Купала з кветкай долі,
каб да агню, запаленага болем,
даслаць вякоў купальскія вянкі.

Як выстрал — першы промень, першы бліск...
Рака часоў... Палаючыя воды...
Вяршыні дрэў над Плошчаю Свабоды
вітаюць Перамогі абеліск.

***

Паўстануць горы і рухнуць сцены,
і сонца свету праб'ецца з хмар —
і будзе жудасна рушыць з цемры,
як навічку на падмосткі сцэны,
па горнім шляху — у светлы Храм.

Прастора — іншых прастораў дзверы,
замкі ўва мне і ўва мне ключы.
Не азірнуцца б на покліч цемры,
не спатыкнуцца б на вокліч цемры
па промню Ісціны ідучы...

Анхела ЭСПІНОСА РУІС

Каханы м(р)ой

Каханы м(р)ой: ты ў іншым вымярэнні,
Мне б пераплыць сакральную раку
Лятучым, легкакрылым летуценнем,
Пацалаваць пяшчотную шчаку!

Любоў мая, нібы блакітны вецер,
Любоў мая, як мёртвая гадзіна,
Любоў мая самотная на свеце,
Любоў мая, як месяц з белай гліны,

Бо ты вясновы выбух грэшных кветак,
І дождж асенніх, вялых пацалункаў,
Кахаю... Я цябе кахаю гэтак,
Як... Не! Няхай ты застанешся думкай.

Палёт

Мне дагэтуль па сходах чуваць і павольныя крокі,
І твой смех у паветры, твой шэпт, і пад коўдрай дыханне,
Мне нагадваюць зоркі цябе, і трава, і аблокі,
І люстэрка тваё мне паказвае адлюстраванне.

А цябе ўжо няма — пазнаю у вачах мінакоў,
У чарніле і ў бледнасці новай, цнатлівай паперы.
А цябе ўжо няма. А мяне асляпіла любоў,
І бачу твой цень я ў пакоях самотнай кватэры.

Ты паўсюль, а мяне ўжо няма, я даўно не існую.
Ты паўсюль, а я тут і цяпер, і заўжды за табою.
Ты паўсюль, нібы бог. Ці мяне пакахаеш зямную?
Ты паўсюль: за зямлёй, за быццём, за вясной, за зімою.

Ты паэзія, музыка часу ды чорнай прасторы,
Ты радок-павуціна між светлых, далёкіх сусветаў,
Дакрануся калісь да цябе?
Замінае мне сорам,
Замінаюць нябачныя межы між нашых планетаў.

Я пайду за табой: узлятаю да шэрага неба.
Я пайду за табой: пад нагамі ў мяне небасхіл,
Я пайду за табой: мне з жыцця больш нічога не трэба,
Легкакрылы твой вецер і вера, бо я — зорны пыл.

Размова

Дождж спявае табе калыханкі,
Лістота чытае вершы
З нешматлікімі прыметнікамі
І дзеясловамі ў мінулым часе.
Вецер лічыць дні да канца месяца,
А цемра сваім шэптам паўтарае
Тыя словы, якія ляжалі забытымі
На дне твайго сэрца.
Гэта шум ночы, гутарка сноў,
Бліскавіца, якая не суцяшаецца,
Але мы не будзем пра гэта:
Мы будзем сядзець рука ў руцэ,
Глядзець у вочы аж да таго, як з'явіцца сорам,
І размаўляць маўчаннем душы да світанку.

Бессань

Маўчыце, думкі! Цішыня!
Бо ноч ляціць, а сон лунае...
І ноч, і сон — усё хлусня,
А бездань ціхая й сляпая.
А па рацэ часін маіх
Плывуць няспынна, гучна, словы:
Каханне, chandra, blood, уздых,
Перамяшаюцца ўсе мовы.

Цяжкі мой ложак, як труна,
Усё, маўляў, як мусіць быць:
Нянавісць, цемра — я адна,
Баліць, баліць, баліць, баліць!

Мая вясна сышла з табой,
Мяне з'ядае ўжо знямога,
Спыніце гэты жорсткі бой!
Без веры я малюся Богу.

Я бачу воблікі сяброў,
Усмешкі іх перад вачыма,
Мяне ратуе шчэ любоў,
А назаўсёды — немагчыма:

За мною забыццё плыве,
Перада мною — брама раю.
Штодня йдзе бітва ў галаве,
На жаль, калісьці я прайграю.

Ліра-парадокс

Мне сніўся верш учора...
І больш за тое — цэлая падборка,
Там ціхім стала мора,
А развітанне — горкім,
І мігацела да світання зорка.

Там я была паэткай.
Твой вобраз за метафарамі тонкі...
Былі сухія кветкі,
І жоўтыя старонкі.
Мне сніўся верш, а сніўся неўзаметкі.

Мне сніліся мы самі
Мне сніліся заўчасная размова
І холад паміж намі,
І паміраля слова
На вуснах, пацалункам між радкамі.

На крылах, над зямлёю,
Мне снілася каханне, як з санетаў:
На небе мы з табою
Ляцелі, як каметы,
Пад намі — паралельныя сусветы.

Анатоль АЎРУЦІН

***

Хачу ў ліцэй, дзе Музы правяць,
Дзе Пушкін плача за сцяной,
Дзе ў поўнач цені кучаравяць
Пакойчык вёрткасцю сваёй.

Хачу, каб грозны і дзяржаўны,
Прастуду змогшы ўсё ж прагнаць,
Прыбыў знянацку сам Дзяржавін
З ліцэйскіх вершаў шал здуваць.

Радок каб слухаў за радочкам,
На дзверы гледзячы знячэў:
«Увойдзе хто яшчэ з лісточкам?
Ну, хто яшчэ?.. Ну, хто яшчэ?..»

Бубніў: «Якія ж вы няздары!» —
І заключаў перад канцом:
«Адно што хлопец цемнатвары
З радком гуллівым — малайцом!..»

А па дарозе да карэты
Кідаў з вяльможнай вышыні:
«Ты Сумарокава, мой свеце,
І Трэдзьякоўскага чытні...»

Хачу ў ліцэй... Там дух маячыць,
Далей адпрэчваючы цьму.
Дуэль не хутка... Пушкін плача...
І сам не ведае, чаму...

***

Сцежка пад распухлаю сасною.
Цішыня, паглядам дзе ні кінь...
Колькі рыфмаў, возера лясное,
У цябе я вычарпаў з глыбінь!

Хоць не ўсё, як трэба, адбылося,
Ды былі са мной мае сябры.
Колькі песень скласці не ўдалося,
Хоць, здаецца, вось яна, бяры...

Дні пяшчот як быццам прамінулі.
Шлях прайсці — не гальштук завязаць...
Нібы рыбка, што з кручка шмыгнула, —
Тое слова, што не змог сказаць...

***

Ізноў хвіліны бягуць крылата,
Ізноў праз вэрхал не чутна слоў,
Ды — не распяты — святлу на пяты
Бялёсы змрок наступае зноў.

Ізноў калышуцца ссірацела,
Нібыта з лёсам даўно на «ты»,
Сасна — над схілам, душа — над целам
І зорка ў хмарыве цемнаты.

У першым гуку — святлеюць далі,
Нібыта ў першым крананні рук.
А што ж там далей? А што ж там далей?
А што ж там далей?.. Нямее гук...

Стагоддзе дваццатае

Стагоддзе дваццатае... Часу бруя
Няўзнак вымывае мінуўшчыны блікі.
А там засталася краіна мая,
Што ў шлях выпраўляла дзівосна-вялікі.

І першая ёлка, і першы мой боль
Ад першага «не» сарамяжніцы Волі,
І нават зламаны пякучы бемоль,
Што ўсе заглушаў да астатку бемолі.

І тая ў халаціку цуд-медсястра,
Што ранак прынесла, прапахлы карболкай...
А рукі не могуць ні дня без пяра,
Нібыта зайздроснік без показкі колкай.

Стагоддзе дваццатае... Грэшніцы лік.
А ў рэчцы, ля мосціка, люстрыцца неба.
Мустыгін, нарэшце, зраўноўвае лік,
І нам да свістка пратрымацца б як-небудзь...

А вечарам Клімава ў ролі Сцюарт,
І ты, за два месяцы ўзяўшы білеты,
Не можаш і высніць той дзень акурат,
Калі ўсё ж грымёрку адчыніш з букетам.

Стагоддзе дваццатае... Гора таму,
Калі існаваў хто адно што для гора,
Сабой прыбліжаючы змрочную цьму,
Заўжды патакаючы злыднаму хору...

Дык дай жа руку мне! З табой спакайней
Пад небам Радзімы яскравіць дазвання.
Мы разам прыйшлі, разам пойдзем далей,
І ў сэрцы — ні горычы, ні шкадавання.

***

Веранда. Поўдзень. Дождж як лава.
На сум не знойдзецца прычын.
І мне даўно ўжо нецікава
Лісты зачытваць ад жанчын.

Хаця ляжыць на крэсле ў спальні,
Там, дзе папер цалюткі стос,
Пісьмо, дзе почырк вертыкальны,
Дзе словы грэшныя наскрозь.

Грашыў... Грашу... І словам грэшным
Мяне ніколі не здзівіць.
Ды гэты голас несуцешны
І сёння мне ў вушах стаіць.

Як не суцішыць тыя мукі?!
Як не адклікнуцца ў бядзе?!
О, тыя сплеценыя рукі
Каля аголеных грудзей!..

І завіток, ледзь кучаравы,
І паўадкрыты чуйны рот...
Веранда. Поўдзень. Дождж як лава.
І пісьмам гэтым — трыццаць год...

З рускай мовы
пераклаў Мікола ШАБОВІЧ

Настасся НАРЭЙКА

Вернасць і вечнасць

Апавяданне

1.

— Ты пойдзеш са мной.

Я гаварыла нешта, тлумачыла, выкідвала рэчы з сумкі, а ён зноў вяртаў іх туды і спакойна паўтараў сваё рашэнне, ніколькі не ўслухоўваючыся ў мой лепет. Тады я ўдарыла яго. Па твары. Як паненкі ў старых раманах.

Павісла цішыня, белая сукенка выпала з яго рук на падлогу. Мне было не да таго, каб думаць пра нейкую анучу. Я адступала да старой шафы, разумеючы з невыказным жахам, як абразілі яго мае паводзіны. Ён прыйшоў выратаваць мяне, забраць з сабой, а я…

Алег заўважыў маё спалоханае адступленне і, у два крокі пераадолеўшы адлегласць паміж намі, схапіў мяне за плечы.

— Мірра!

Я сцялася.

— Я ненавіджу цябе!

— Так, так… — я ківала, як заведзеная, глытаючы слёзы.

— Я ненавіджу цябе за тое, што ты так думаеш пра мяне! Я ніколі не зраблю табе балюча, чуеш?!

Ён страсянуў мяне так, што клацнулі зубы.

— Яны прачэсваюць усё наваколле, Мірра! У іх нюх на яўрэйскую кроў. Ваша сям'я — адзіныя яўрэі ў вёсцы. Ты пойдзеш са мной!

Алег нічога не разумеў і не хацеў мяне слухаць. Як дастукацца да яго? Божа, як?!

— Я не пайду.

— О-о-о…

Ён застагнаў, адпусціў мяне, сеў. Абхапіў ускудлачаную галаву рукамі, нібыта хацеў раздушыць яе, як арэх. Я зразумела, што мне даецца апошні шанец.

— Я растлумачу, Алежак, мілы! — я прысела ля яго ног. — Маю маці і двух братоў расстралялі літаральна ў мяне на вачах.

— Я ведаю.

— Так, так, гэта ведаеш, але… Я пахавала іх у пограбе.

— Ты? — Алег недаверліва зірнуў на мяне.

— Я. За тры ночы. Ніхто не ведае. Мне нельга пайсці адсюль. Калі вернецца бацька, павінен быць нехта, хто раскажа яму. Там, пад намі, — я дакранулася пальцамі да бруднай, халоднай падлогі, — татава жонка і два яго сыны.

— Мірра! — ён пакруціў галавой, не ведаючы, што адказаць, разумеючы маю непахіснасць і жахаючыся яе.

— Мяне не знойдуць. Як тады не знайшлі, паверылі, што я памерла. Мяне няма, Алег. Я — цень.

Ён узяў маю руку.

— Цень. Празрыстая, — яго пальцы абвілі маё танюткае, як у дзіцяці, запясце. — Бязважкая.

Ён падняўся і падняў на ногі мяне. Я была ніжэйшая на цэлую галаву, і яму даводзілася нахіляцца, каб бачыць мае вочы.

— Як ты будзеш жыць?

— У склепе.

Ён скалануўся ўсім целам.

— Там бульба.

Вусны Алега выгнуліся ў крывой усмешцы.

— Ага. А яшчэ сырасць, холад, цемра, пацукі і трупы!

Я адхіснулася, вырваўшы руку.

— Замаўчы!

Я гатовая была зноў ударыць яго.

— Твой бацька не вернецца, Мірра! — Алег гаварыў не думаючы, і словы рвалі яго на часткі. — Ён мёртвы! Табе пара зразумець.

— Я разумею! Але не веру, Алег! Я не веру ў тое, чаго не бачыла. Іх, — я паказала на падлогу, — я бачыла мёртвымі. А бацьку — не! Я буду чакаць. Скажы, — я закінула галаву, каб паглядзець у яго цёмна-сінія вочы, — хіба ты не хацеў, каб нехта чакаў цябе? Чакаў з любой дарогі. Нават з той, з якой не вяртаюцца?

Алег глядзеў на мяне так, нібыта ніколі раней не бачыў.

— Я хачу, каб ТЫ чакала мяне.

І ў словах гэтых было столькі дзіцячай веры ў лепшае! Так гаворыць маленькі хлопчык сваёй любімай матулі…

І я не ўтрымалася. Прыўзнялася на дыбачкі, каб пацалаваць яго ў лоб, як сына. Але ён злавіў мае вусны сваімі, і я зразумела, што буду чакаць яго, чакаць не як маці, а як жонка. Імгненнем пазней Алег адпусціў мяне.

— Пойдзем са мной. Апошні раз прашу.

— Не магу.

Ён схапіў са стала шапку, насунуў на кудлатую галаву і, не вытрымаўшы, азірнуўся ля дзвярэй.

— Тваё чаканне не будзе марным, Мірра.

Яго позірк упаў на белую сукенку, кінутую на падлозе, на бурыя плямы, што праступалі на ёй. Я ясна пачула, як скрыгатнулі зубы Алега, а потым ён выйшаў.

2.

— Хутчэй!

Людвіг рыўком адкінуў крышку, якой зачыняўся склеп, і лёгка падштурхнуў мяне да краю, дзе мацавалася лесвіца. Я пахітала галавою і, адступаючы крок за крокам назад, малельна правяла позіркам па родных тварах. На маміным гарэлі страшным унутраным святлом вялізныя вочы. Яна стаяла над швейнай машынкай, не выпускаючы з рук канец недастрочанай тканіны (другі ўсё яшчэ трымала лапка). Твар Зэліка стаў такі пранізліва-белы, што цёмныя бровы, якія сыходзіліся на пераносіцы, здаваліся вугальнымі, быццам на лоб брата чорнай птушкай села трывога. А ў жорсткай лініі рота Людвіга была такая рашучасць, што я ледзь не завыла, бяссільная, безабаронная.

Старэйшы брат усё яшчэ трымаў мяне за руку вышэй локця, балюча сціскаючы і не заўважаючы гэтага.

— Хутчэй, Мірра!

Я зноў адмоўна пахітала галавой.

— Людвіг…

Ён не слухаў мяне. Амаль жорстка падхапіў і проста кінуў у склеп. Я моцна выцялася аб лесвіцу, аж з вачэй градам пасыпаліся слёзы.

— Мама!

Мой крык захлынуўся ў цемры, калі крышка склепа гучна бразнула над галавой. Не! Не! Я барабаніла кулакамі, не гледзячы, па чым, і плакала наўзрыд. Не хачу! Не хачу! Не хачу такога выратавання!

Спробы падняць крышку нічога не далі. Я пачула, як Людвіг цяжка наступіў на яе, не пакідаючы мне аніякага шанцу.

Я крычала, плакала, збівала рукі да крыві, пакуль мой голас канчаткова не сеў. Цемра ціснула на плечы, а там, наверсе, было так ціха, што я адчула дзікі боль недзе глыбока ў скронях…

Яны прыйшлі праз некалькі хвілін, якія падаліся мне гадамі. Пад іх цяжкімі крокамі стагнала падлога, як стогне ўжо чацвёрты год запар уся наша зямля.

У мяне засталіся сілы толькі на тое, каб ціха плакаць. Я чула гучныя галасы немцаў (яны крычалі, як заўсёды) і роўныя, спакойныя словы ў адказ (мае мама і браты ніколі не павышалі голас).

«Дзе дзеўка?» Гэтае пытанне, паўторанае тройчы, прымусіла мяне сцяцца ўнутры да болю. Я была адзін суцэльны вузел.

Людвіг гаварыў спакойна. Я літаральна бачыла яго вялікія, цёмныя, як ноч, вочы, што пазіралі ў твар ворагу з поўнай абыякавасцю. «Ёсць толькі вернасць і вечнасць», — казалі яны.

Людвіг тлумачыў, што я памерла, што свежая магіла мая ў садзе і яны могуць паглядзець, калі жадаюць.

Нехта з немцаў выйшаў. Я ведала, што ён упэўніцца: мой брат не лгаў. Там, пад старой яблыняй, сапраўды пахаваны чалавек. Яго клікалі Іванам. Ён быў з партызанскага атрада, прыйшоў да нас параненым і памёр у мамы на руках тры дні таму.

Я абхапіла калені, схаваўшы ў іх твар, і заплюшчыла вочы.

Зноў загергеталі рэзкія, непрыемныя галасы, а пасля… Пачуліся тры стрэлы… Адзін за адным… Прытомнасць злітавалася нада мной нарэшце і пакінула, здавалася, назаўжды.

Ачуняла я немаведама праз колькі часу. Было так ціха, нібыта свет знік. Я зноў паспрабавала падняць крышку, але яна стала жудасна цяжкай. Трэба выйсці! Абавязкова выйсці! Я ведала, ШТО ўбачу наверсе, страшылася гэтага, але выйсці было неабходна. Не дзеля сябе — дзеля іх.

Я сабрала ўсе магчымыя сілы, і ў рэшце рэшт крышка крыху прыўзнялася. Яшчэ… Яшчэ! Нешта цяжкае адкацілася ўбок, і я змагла амаль напалову адкрыць склеп. Першае, што я ўбачыла, калі зрок прызвычаіўся да чырванаватага святла вячэрняга сонца, — шырока расплюшчаныя маміны вочы, падобныя на дзве разбітыя поўні.

З грукатам я зноў паляцела ўніз. А крышка ляпнула так аглушальна, што свет раскалоўся надвое. Час ДА і ПАСЛЯ.

Скончана.

Я паднялася зноў і на гэты раз выбралася-такі са свайго сховішча.

Мама і Зэлік ляжалі поруч, і яго рука ўсё яшчэ сціскала яе тонкія пальцы. А Людвіг нават пасля смерці сваім целам закрываў ад ворага мяне, зачыненую ў склепе.

Усю ноч я праседзела, размаўляючы з імі, а пасля знайшла ў сенцах рыдлёўку...

3.

Я нічога не бачыла і ішла па садзе навобмацак, кранаючы рукамі шурпатыя, прахалодныя пасля ночы ствалы дрэў. За чарговы бясконцы дзень, праведзены ў склепе, вочы мае зноў аслеплі, і я асцярожна рухалася за салодкім, бела-ружовым пахам яблыневай квецені.

Страху не было. Недзе побач вуліцы патрулявалі стомленыя бяздзейнасцю паліцаі, а самі немцы ўвогуле не пакідалі старога будынка школы, дзе наладзілі свой штаб. Работы ні тым, ні другім больш не было: усе яўрэі (акрамя мяне) перабітыя, здольныя працаваць мясцовыя жыхары вывезены ў Германію, а няздольныя проста не мелі ніякіх сіл на бунт супраць ворага.

Я прыхінулася спінай да самай высокай яблыні і заплюшчыла пустыя вочы, чакаючы, калі яны зноў, як раней, пачнуць бачыць. Я не збіралася сёння ісці на пошукі ежы, бо голаду зусім не адчувала. Бульба ў маім склепе, якой ратавалася ўсе гэтыя пяць месяцаў, скончылася. Аднак трывогі не было. Нічога не было.

Каб не саслізнуць па дрэве ўніз (ногі слаба трымалі), я моцна абхапіла яго рукамі.

Пачынала віднець. Я ведала гэта, бо ў вачах маіх, зноў расплюшчаных, чарнота пачала паступова насычацца прыемным, ружовым святлом.

Я слухала свет.

Я чула свет.

Вечны свет.

Не выбухі, не аўтаматныя чэргі, не крыкі і стогны, а пошум ветру ў цёплай лістоце, посвіст салаўя ды яшчэ…

— Рахіль!

Ад пярэпалаху і нечаканасці я расчапіла рукі за спінай і ўпала б, калі б зрок мой раптоўна не вярнуўся.

— Рахіль…

Я павярнула галаву ў той бок, адкуль даносілася імя маёй маці, і слёзы шчасця струменямі пацяклі па шчаках. Бацька подбегам кінуўся да мяне, але за два крокі рэзка спыніўся, адхіснуўся з крыкам ці то страху, ці то здзіўлення.

— Мірра?!

Мы з мамай заўсёды былі вельмі падобныя знешне, а цяпер, відаць, — асабліва…

«Няўжо я так пастарэла?..» — падумалася мне без усялякага хвалявання, зусім абыякава.

Тата абдымаў мяне, і мы плакалі разам. А з патрывожанай яблыні сыпалася нам на плечы, рукі, у валасы салодкая белая квецень. Сад цвіў, абяцаючы, што будзе тут яблычнай восень…

Мы плакалі.

Мы не ведалі тады, што немцаў ужо амаль суткі як няма ў вёсцы.

Мы не ведалі тады, што да Перамогі заставалася зусім мала.

Мы не ведалі тады, што лічаныя кіламетры пыльнай прасёлачнай дарогі аддзяляюць ад гэтага саду майго Алега.

Мы ведалі адно: «Ёсць толькі вернасць і вечнасць».

Мой старэйшы брат Людвіг ніколі не лжэ...

Млын навін

***

На выстаўцы мастацкіх галаграм «Асвета. Пазнанне. Прагрэс» у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі з нагоды святкавання Дня Незалежнасці ўвазе наведвальнікаў прадстаўлены новыя экспанаты — галаграмы «Герб Рэспублікі Беларусь» і «Герб Беларускай ССР». Экспазіцыя ўключае каля 150 экспанатаў, створаных вядучымі беларускімі прадпрыемствамі «Магія святла» і «Галаграфічная індустрыя». Сярод работ — атрыбутыка Вялікай Айчыннай вайны, хрысціянскія рэліквіі, музейныя каштоўнасці, старадрукаваныя выданні з фондаў сталічнага «алмаза», тэхніка, арт-кампазіцыі, прырода, архітэктура.

***

Швецыя перадала музею Дугі Струвэ ў Гальшанах (Ашмянскі раён) чатыры старадаўнія геадэзічныя прыборы, з дапамогай якіх у пачатку XX стагоддзя праводзіліся трыангуляцыйныя вымярэнні. Пошук і ўзнаўленне пунктаў Дугі Струвэ сталі справай гонару для беларускіх геадэзістаў. Праўда, першая спроба, зробленая ў 1999 годзе, аказалася безвыніковай. Аднак праз два гады спецыялісты «Белаэракосмагеадэзія» Дзяржкаммаёмасці правялі маштабныя пошукава-даследчыя работы па ўдакладненні месцазнаходжання пунктаў Дугі Струвэ на тэрыторыі сучаснай Беларусі. І сёння іх выяўлена ўжо 19 з 31. Усе ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі і ахоўваюцца дзяржавай. Пяць пунктаў, якія найболей захаваліся, увайшлі ў Спіс аб'ектаў Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

***

Падчас Міжнароднага конкурсу-фестывалю «Фотакрок» імя Сігізмунда Юркоўскага, вядомага фатографа XIX стагоддзя, у Віцебску адкрылі музей фатаграфіі. Імя Сігізмунда Юркоўскага будзе насіць і музей, які размесціцца ў цэнтры гістарычнай часткі горада. Тут можна будзе ўбачыць выставачную экспазіцыю, паназіраць за таемствам у «цёмным» пакоі, выпіць кубак духмянай кавы, сфатаграфавацца ў старадаўнім атэльле і атрымаць стылізаваную фотакартку, як быццам створаную ў фотасалоне XIX стагоддзя. Новы музей стане лагічным і годным працягам гарадской музейнай канцэпцыі па ўвекавечванні імён знакамітых гараджан, якія праславілі Віцебск на ўвесь свет, стане не проста сховішчам прадметаў фотамастацтва і даследчым цэнтрам, але і новай прасторай гарадскога жыцця.

***

Музей традыцыйнага ткацтва Паазер'я запрашае 7 ліпеня на майстар-клас «Ткацтва з купальскіх раслін» па вырабе габелену з траў. Традыцыйна травы, расліны і зёлкі збіралі ў вызначаныя дні, калі яны набіралі найбольшую лекавую моц. Потым іх выкарыстоўвалі ўвесь год як абярэгі, імі ўпрыгожвалі абклады абразоў, гатавалі настоі для лячэння. Бралі самыя звычайныя травы, але ж як яны, сатканыя, пачынаюць граць сваёй фактурай! Зярняткі, каробачкі, зёлкі ствараюць сапраўднае палатно. Травы цікавыя не толькі фактурай, але і прыродным водарам. Ёсць расліны, якія гадамі захоўваюць тонкі пах. Ткацтва травамі — бясконцае захапленне, якое дорыць новыя ідэі і адкрыцці. А прыродная разнастайнасць, арыгінальны знешні выгляд дарожак, дываноў, габеленаў упрыгожыць любы дом.

Міра ІЎКОВІЧ

СВЯТАР

Чэрвеньскай раніцай у нядзелю немцы выехалі на машыне з горада Драгічына ў вёску Белін, якая раскінулася побач з Днепрабугскім каналам. Да вайны ў яго была іншая назва — Каралеўскі. Пачалі будаваць яго яшчэ пры кіраванні апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Панятоўскага — адсюль і назва. У Беліне немцы сабралі людзей, зачыталі загады акупацыйных улад і сабралі прадукты. Летам 1942 года канал быў суднаходны, дзейнічалі шлюзы, і немцы даволі свабодна ездзілі па тэрыторыі, нападаў не баяліся. Партызаны ў гэтых краях толькі з'яўляліся. Дзейнічалі адно асобныя групы з акружэнцаў, ваенных, ваеннапалонных, якія ўцяклі з лагераў, і мясцовых жыхароў.

Але ў той дзень акупанты з Беліна паехалі за канал у Дыферэнцыю. Пакуль былі там, сувязныя перадалі партызанам, што немцы будуць вяртацца па дарозе Белін — Осаўцы — Драгічын. Вырашана было зрабіць засаду паблізу вёскі Осаўцы, дзе знаходзіліся шматлікія хутары.

Немцы пасля абеду выехалі на Осаўцы, але пра магчымую засаду іх, мабыць, хтосьці папярэдзіў. Перад самым уездам у лес машына спынілася, салдаты вылезлі з кузава і рассыпаліся ланцугом. Нямецкі афіцэр пусціў наперад пустую машыну. Яна павольна ехала, а салдаты ішлі за ёй напагатове са зброяй па вузкай лясной дарозе.

Калі нямецкія салдаты падышлі да месца засады, партызаны з-за сасны кінулі пад машыну гранату і сталі яе абстрэльваць. Немцы да нападу былі гатовы. Пачалася перастрэлка. Немцаў аказалася больш, і партызаны сталі адыходзіць па лесе ў бок вёскі. Пасля бою ворагі прачасалі лес…

Параненага партызана немцы павезлі на машыне з сабой у Драгічын. Недалёка ад месца бою арыштавалі белінскую дзяўчыну, якая ішла ў той час дамоў па лясной дарозе. Яе вазілі ў Драгічын на допыт, але пераканаліся, што яна не мае дачынення да нападу, і адпусцілі. Яна потым распавядала, што на допыце паранены партызан трымаўся вельмі мужна, нікога не выдаваў. Сказаў, што не ведае нікога ў вёсцы Осаўцы, што не мясцовы, а іх група ішла на ўсход і вырашыла здабыць сабе зброю ў баі. Але немцам ужо было вядома, што партызаны стаялі ў гэтых краях, і камусьці трэба было адказваць за напад на нямецкіх салдат...

На наступны дзень раніцай у Осаўцы прыехаў нямецкі карны атрад — гэтая вёска знаходзілася бліжэй за іншыя да месца бою. Усіх жыхароў паліцаі сабралі ў цэнтры на пляцы ля скрыжавання дарог.

На скрыжаваннях дарог і на ўездзе ў вёску ў той час ставілі крыжы — каб абазначыць, да якой веры адносяцца яе жыхары і абараніць сябе ад бяды. Там, каля крыжа, і сталі людзі.

Нямецкі афіцэр праз перакладчыка сказаў жыхарам, што за напад і забойства нямецкага салдата будзе адказваць уся вёска, калі не выдадуць тых, хто звязаны з партызанамі, і тых, хто ім дапамагаў. Паклікалі старасту. Той засведчыў: ніхто не ведае людзей, што напалі ў лесе на нямецкіх салдат. Людзі пацвердзілі, што ў вёсцы партызан няма. Немец выслухаў і сказаў, што ўсе будуць расстраляныя, калі не выдадуць вінаватых. Потым загадалі старасту адабраць некалькі здаровых мужчын і ўзяць лапаты. Паліцаі павялі іх у лес капаць вялікую магілу — адну на ўсіх.

У той час немцы сталі вадзіць ў гміну некаторых мясцовых жыхароў, дапытвалі. А людзі каля крыжа ўвесь час са страхам чакалі, што будзе далей. Разумелі, што іх могуць расстраляць. Памяталі, як у жніўні 1941 года ў лесе за царквой былі расстраляны карным атрадам мясцовы актывіст Мікіта, настаўнік Кляйнвекслер і двое былых ваеннапалонных, якія жылі ў той час у суседняй Вульцы Папінскай, — старшы лейтэнант Саша і Міша па прозвішчы Беларус. Таму паміж сабой дамовіліся, што калі ўсіх павядуць на расстрэл, то ў лесе ўсе пабягуць у розныя бакі. Можа, хтосьці шчаслівы і ўратуецца.

Людзі сядзелі ля крыжа і маліліся. Калі немцы выйшлі з гміны, афіцэр гучна аддаў каманды салдатам, усё стала зразумела. Але стары вясковы дзед папрасіў афіцэра:

— Калі нас зараз расстраляюць, дазвольце, каб да нас перад смерцю прыйшоў бацюшка. З бацюшкай лёгка паміраць…

Святар Антон Аляхновіч жыў тады з сям'ёй у невялікай хатцы каля царквы. Царква ў Осаўцах знаходзіцца на ўскраіне, даволі далёка. Бацюшка Антон прыйшоў пешкі, у чорнай адзежы святара з вялікім прыгожым крыжам. Падышоў да людзей і асяніў іх крыжам, паспеў прачытаць малітву, пакуль з гміны прыйшоў афіцэр. І звярнуўся да яго:

— Пан афіцэр, нямецкая нацыя здаўна лічыцца адной з самых культурных у Еўропе. Яна дала свету знакамітых філосафаў, літаратараў і музыкантаў...

Немцу, відаць, спадабалася пачутае ад перакладчыка, заківаў галавой:

— О! Я, я, гут!..

Бацюшка працягваў:

— Яны прапаведавалі гуманізм, і ніхто з іх ніколі не мог падумаць, што немцы могуць расстрэльваць нявінных заложнікаў. Тое, што вы хочаце зрабіць, — недастойна вас… Паглядзіце, тут стаяць простыя сяляне, сярод іх жанчыны і дзеці. Гляньце на іх рукі — яны кожны дзень зарабляюць свой хлеб надзённы. Я ведаю ўсіх людзей у Осаўцах, гэта мірныя жыхары… Не бярыце на сваю душу грэх!

Немец задумаўся над словамі бацюшкі, пасля паклікаў яго ў гміну. Яны доўга размаўлялі — вялі дыспут пра тое, у чым сутнасць вялікай культуры… Магчыма, той нямецкі афіцэр да вайны меў адносіны да адукацыі ці культуры. А можа, бацюшка Антон здолеў знайсці на дне яго душы кроплю сумлення.

У выніку працяглай размовы немец прыняў рашэнне расстрэл адмяніць.

Вяскоўцаў пратрымалі амаль да вечара і адпусцілі, прыстрашыўшы, што за сувязь з партызанамі надалей будзе адказваць уся вёска. Немцы загадалі старасту, каб сабралі для іх яйкі, сала і масла, і атрад пакінуў вёску.

Уратаваныя людзі плакалі, смяяліся, абдымаліся. Дзякавалі Богу, што абмінула іх страшная доля. І здзейсніў бацюшка Антон падзячную малітву Богу за выратаванне ўсіх жыхароў.

Сёння, як і ў тыя ваенныя гады, на месцы ратавання вёскі стаіць вялікі дубовы крыж, адноўлены жыхарамі ўжо ў наш час. Ён і цяпер сімвалізуе абарону і паратунак.

Яшчэ некалькі гадоў пасля вайны бацюшка Антон служыў у мясцовай Свята-Міхайлаўскай царкве, а потым перавялі служыць у іншае месца, і сляды яго згубіліся.

Аляксандр ПАЎЛЮКОВІЧ

Парэнчы Вайсковых могілак

Ну й мацярык: не сціхлі
дрэнчы-енчы.
Народ — няўрод?
…Бо тузаюцца ўсе.
Так,
агароджа могілак — парэнчы, —
каб не ссівела Памяць у лазе.
Парэнчы — каб засведчыць:
бачым строму.
Падзел прасторы
трэба пільнаваць…
Магілка вунь — як ганачак ля
дому.
Крышыць крыжы —
як свой хрыбет ламаць.
Тупее адубелы недалюдак.
Пільнуе? Мо выконвае наказ,
каб над зямлёй
людзей мець за малютак,
бо продкі пад зямлёю — без
прыўкрас.
За кій хапаецца неасцярожны
следчы.
Хістаюцца
над морам слёз
парэнчы…
Збуцвее
продкаў мацярык
без нас,
бо агароджа — космасу
парожак…
***
Калі народнае паўзе ў бязбожжа, —
Трымаецца парэнчаў вечны Час.

Сяргей ПАНІЗНІК

Адчуць самакаштоўнасць

Нашы захапленні не толькі аздабляюць жыццё, але і змяняюць навакольны свет. Паспяховыя культурныя праекты дапамагаюць вырашыць сур'ёзныя сацыяльныя праблемы — і гэта той выпадак, калі ад добрай каманды залежыць вельмі шмат. Пра ўласны досвед распавядае Настасся КУХАРЭНКА — арганізатарка фэсту традыцыйнай культуры «Пятровіца». Вялікае фальклорнае свята ў вёсцы Шыпілавічы дапамагае сялянам пачувацца больш годна і вяртае вёсцы маладосць — прынамсі, на некалькі дзён…

— Ці адразу атрымалася наладзіць добрыя стасункі з вяскоўцамі?

— Пачнём з таго, што Пятрок — свята нашай вёскі, здаўна ўсталяванае царквой. Сваёй царквы ў Шыпілавічах не было, таму на «Пятровіцу» прыязджаў святар, служыў малебен. У гэты дзень ладзіўся гасцявы кірмаш: прыязджалі сваякі, гулялі свята, увечары частаваліся юшкай. Калі ж этнограф Сяргей Выскварка даведаўся пра абрадавую частку, то пачаў па крупінках узнаўляць апісанне абраду, і мы здолелі аднавіць яго амаль цалкам.

«Пятровіца» заўсёды ўспрымалася вяскоўцамі як свята, але моладзь з'язджала, старэйшым людзям бракавала здароўя і часу. І вось мы рыхтуемся да першай «Пятровіцы», ходзім па хатах, пытаемся, ці можна пасяліць людзей… Спачатку наша ідэя была прынята ў штыкі. Ніхто апроч суседзяў не хацеў пускаць гасцей. Казалі: «Будуць піць, п'яныя хадзіць, нашто нам столькі людзей». Было непрыемна, але не — дык не, абыдземся без вас. А потым вяскоўцы ўбачылі, што 50 чалавек ходзяць у прыгожых строях, танцуюць, спяваюць песні… Вёска пачала жыць і ўдзень, і ўночы, бо з'явілася музыка — спевы, гоман… Мясцовыя жанчынкі ўсцешыліся: «От, як раней!» Наступным разам нам вёдрамі прыносілі агуркі, перадавалі яйкі, некаторыя прапаноўвалі пасяліць каго ў сябе.

Многія вяскоўцы на «Пятровіцу» ідуць да клуба на канцэрт, на свята, хто не можа — чакае, пакуль мы будзем абыходзіць вёску карагодам. Пятроўцы паказваюць іншы фармат святкавання — са спевамі і танцамі замест алкаголю і боек. Супольнае святкаванне — важны, прыгожы і вясёлы варыянт адпачынку, які застаўся нам ад традыцыйнай вясковай культуры. Калі прааналізаваць, колькі часу, сродкаў і фантазіі цяпер надаецца стварэнню карпаратыўнай культуры ў творчых калектывах, дзе супрацоўнікі часам не ведаюць, як адзін аднаго павіншаваць са значнай падзеяй, то, відавочна, досвед традыцыйнай культуры сёння вельмі карысны.

Фэст «Пятровіца» пачынаўся з жадання шмат танцаваць, жыць у традыцыйнай культуры, праектаваць успрыманне свету, якое было ў носьбітаў традыцыйнай культуры, і браць лепшае з гэтага ладу жыцця. У 2011 годзе ў вёсцы Шыпілавічы адбылася першая «Пятровіца»: некалькі дзён тут жыла моладзь, мы танцавалі па 8 гадзін на дзень… Цяпер на «Пятровіцы» (да Дня святых апосталаў Пятра і Паўла) мы, па-першае, танцуем, па-другое, спяваем, па-трэцяе, ездзім у этнаграфічныя вандроўкі — да людзей, якія могуць падзяліцца ведамі, досведам, навучыць свайму рамяству, паказаць сябе, свой лад жыцця. Гэта шчырыя людзі, якія не прыстасаваліся да гарадскога кансьюмерскага, рынкавага ладу жыцця. Такі чалавек альбо шчыра ўспрымае цябе як ворага (бо ты не з нашай вёскі), або гэтаксама шчыра вядзе ў хату і літаральна за гадзіну робіцца родным. Такія людзі адкрытыя і сапраўдныя, яны паводзяць сябе натуральна — і гэтага вельмі не хапае многім нашым сучаснікам.

Этнаграфічныя вандроўкі важныя не толькі для ўдзельнікаў фэсту, але і для саміх вяскоўцаў. Шчыраму вяскоўцу патрэбна ўвага звонку, патрэбна разуменне, што яго песні, танцы, рэчы, якія рабіла яго бабуля, — гэта істотна для іншых. «Пятровіца» — рэкламны сродак простых шчырых вясковых людзей. Бо многім беларусам бракуе самапавагі, адчування самакоштоўнасці, прыняцця сябе як роўнага сярод роўных. Адпаведна, не стае ўсведамлення самакаштоўнасці беларускай нацыі ў свеце, што мае шмат прычын, у тым ліку гістарычных.

— «Пятровіца» — супольнае свята, інтэграванае ў вясковае жыццё...

— Напэўна, справа ў збегу абставін і здольнасці рызыкнуць, зрабіць нешта неардынарнае. Па-першае, я нарадзілася на Любаншчыне, тата родам з Шыпілавіч, як і знаны этнограф Павал Шпілеўскі. Было дастаткова камунікатыўных сувязяў, кантактаў і рызыкоўнасці, каб запрасіць у госці 50 чалавек. Вядома, умовы паўтурыстычныя — хто згодны: той прыязджае.

Па-другое, у час нараджэння «Пятровіцы» атрымалася злавіць жаданне моладзі — выехаць у вёску і натанцавацца. А далей — змены, аналітыка… І вялікая падтрымка з боку Алены Міхалені, загадчыцы Шыпілавіцкага СДК і галоўнай гаспадыні свята.

Па-трэцяе, Любаншчына — гэта выдатны раён, калі казаць пра стан традыцыйнай культуры. Раён этнаграфічна не самы багаты, але больш за 25 гадоў тут адказна і грунтоўна ідзе работа па зборы, пераасэнсаванні і вяртанні ў жывое бытаванне фальклорных здабыткаў і практык. Кіраўніцтва і супрацоўнікі культуры — адданыя людзі, якія робяць тое, што, здаецца, ляжыць на паверхні, але ў многіх не атрымліваецца. Гэта ў тым ліку вялікая праца па падтрымцы носьбітаў традыцыйнай культуры, гуртоў, якія трэба «паказваць свету» і якім патрэбны госці. На Любаншчыне супрацоўнікі культуры разумеюць, што сутнасць працы не ў тым, каб скласці скарбы ў скрынку і паставіць на палічку на доўгае захаванне, не ў колькасці канцэртаў «для птушачкі». Мэта — гэта пераемнасць, захаванне культурных скарбаў у душах.

— Ці магчыма стварыць такое ж супольнае свята ў іншых рэгіёнах Беларусі — альбо на Любаншчыне людзі такі больш адкрытыя і добразычлівыя?

— Кожнаму чалавеку можна патлумачыць уласную значнасць, калі прывязём да яго гасцей, калі да яго будзе ўвага звонку. Гэтая ўвага — дадатковы імпульс цікавасці да сябе. Было б выдатна, каб у кожным раёне была свая «Пятровіца», бо ў кожным раёне ёсць людзі, зацікаўленыя этнаграфіяй. Але праблема ў тым, што сродкі (грошы і час) не заўсёды размяркоўваюцца эфектыўна. І, тым не менш, Беларусь танцуе. Праект «Свае танцы» быў падтрыманы больш чым у 10 гарадах Беларусі. Ужо другая ноч танцаў адбылася ў засценку Скрыплёў на Валожынчыне, пастаянна ладзяцца танцавальныя вечарыны ў Мінску, Магілёве, Гародні, Гомелі.

— Як ставяцца да вашага свята вясковыя дзеці і падлеткі?

— «Пятровіца» — свята найперш для дарослых. Дзеці і падлеткі часта прыязджаюць з бацькамі, далучаюцца да свята, але гэта не наша фокус-група. Увогуле, знаёмства дзяцей з традыцыйнай культурай мае адбывацца ў межах адукацыйных праграм, павінна быць добрая методыка і фінансаванне. Арганізаваць дзіцячы летнік накшталт «Пятровіцы» цалкам рэальна. Галоўнае — распрацаваць план дзеянняў. Спачатку вызначаем мэту. Потым ацэньваем рэсурсы: у мяне ёсць гэта і гэта, але няма вось гэтага (часта часу і грошай)… Але я паспрабую па-іншаму з тымі рэсурсамі, якія ёсць, бо справа вартая! Выбудоўваем задачы, вызначаем чэк-поінты, аналізуем вынік — гэта шлях рашэння любой праблемы. Іншая рэч — многія не ўмеюць ставіць задачы, своечасова рабіць высновы і глядзяць на праблему проста: «Дайце мне грошы і працоўныя рукі — і я столькі зраблю…». Спадзяюся, што дзякуючы намаганням неабыякавых, дзякуючы сацыяльнаму прадпрымальніцтву і ў прыватнасці конкурсу *Social Weekend* будзе болей эфектыўных праектаў, людзі навучацца разумець, з якога боку брацца за рэалізацыю мараў.

— Ці звяртаюцца да вас аднадумцы па параду, каб ладзіць свята накшталт «Пятровіцы»?

— Шмат праектаў узнікае адначасова, складана сказаць, хто чый досвед пераймае. Магчыма, у пэўнай ступені дзякуючы «Пятровіцы» на Любаншчыне з 2012 года ўтварыўся клуб аматараў традыцыйнага танца, традыцыйнай культуры «Напарачка». Удзельнікі клуба — дарослыя людзі 1950—1960-х гадоў нараджэння. Гэтае пакаленне з-за гістарычнага развіцця падзей, уплыву савецкай ідэалогіі выпала з традыцыйнай культуры. Маё пакаленне — пераемнікі традыцыйнай культуры ад бабуль, але не ад сваіх маці. І гэты разрыў смяротна небяспечны для традыцыйнай культуры, бо старэйшыя бабулі сыходзяць, а прыйдуць бабулі, адлучаныя ад традыцыі, не здольныя перадаць досвед мінулых пакаленняў. Дзякуючы клубу «Напарачка» ёсць спадзеў, што на Любаншчыне праблема пераемнасці будзе вырашана, і гэта паказвае, што работнікі культуры працуюць правільна. Клуб вельмі дапамагае нам у арганізацыі свята. Напрыклад, на мінулым фэсце сябры клуба шыкоўна падрыхтавалі стравы і іх прэзентацыю, пятроўцы былі ў прыемным шоку ад багатага стала.

— Арымліваецца, што тыя, да каго вы завітваеце падчас этнаграфічных вандровак, — найперш «дасведчаныя» носьбіты традыцыйнай культуры?

— …альбо тыя, хто жывуць у вёсцы і маюць што сказаць. Таму і важна ездзіць да іх — вучыцца, набываць досвед, пераймаць традыцыю. Не так даўно ў Мінск прыязджаў сусветна вядомы акушэр Мішэль Адэн і сказаў, што цяжарным жанчынам трэба спяваць. Для сучасных мам гэта адкрыццё. Але стагоддзі таму пра гэта ведалі нашы бабулі — вясковыя жанчыны, — а мы ўжо не ведаем, бо ў сучаснай сям'і гэтаму не вучаць. Згубленых ведаў насамрэч шмат, і важна аднаўляць іх праз непасрэдныя стасункі, бо гэта паляпшае якасць жыцця.

Сучаснаму чалавеку ёсць што запазычыць з традыцыйнай культуры. Традыцыйная культура існуе насуперак тэндэнцыям масавага попыту, традыцыя — гэта індывідуальнасць і скіраванасць на ўнікальныя рэчы, самадастатковыя па сваёй сутнасці, якія да таго ж не робяць шкоды навакольнаму асяроддзю і іншым. Гэта падыход да існавання, якога не хапае сучаснаму чалавеку. Бо карыстанне і спажыванне, якое актыўна папулярызуецца, супрацьпастаўляецца стварэнню. Стварэнне здольнае змяніцца, адаптавацца і выжыць, а спажыванне заканчваецца, калі заканчваюцца сродкі альбо рэсурс спажывання. Гэтая простая ісціна вельмі дапамагла б сёння нашым суграмадзянам...

Алеся ЛАПІЦКАЯ

З РАЗМАХАМ ЖЫЦЦЯЛЮБА

Страты і набыткі Валянціна Волкава

Упершыню грандыёзнае палатно Валянціна Волкава «Мінск 3 ліпеня 1944 года» гледачы ўбачылі ў 1953 годзе на Рэспубліканскай выстаўцы ў Мінску. Карціна была замоўлена для фае залы пасяджэнняў Дома Саветаў. Волкаў заключыў дамову ў сакавіку 1945 года. Інтэр'ер шмат у чым абумовіў памеры і фармат твора — больш за 5 метраў у даўжыню і каля 3 метраў у вышыню. Над карцінай мастак працаваў амаль 9 гадоў у сваёй майстэрні на вул. Усходняй. Карціне папярэднічалі 11 вялікіх эскізаў кампазіцыі, больш за 220 падрыхтоўчых малюнкаў, каля 50 эцюдаў.

Чаму гэты адказны дзяржаўны заказ быў даручаны менавіта Валянціну Волкаву?

ПАСЛЯ АКУПАЦЫІ

Па-першае, ён быў самым прафесійным жывапісцам у нешматлікім тады (40 чалавек) Саюзе мастакоў у Мінску. Волкаў, сын іканапісца, скончыў Пензенскае мастацкае вучылішча, у 1915 годзе — Пецярбургскую акадэмію мастацтваў, дзе яго настаўнікам быў У. Я. Савінскі, майстар кампазіцыйнай карціны. Па-другое, Волкаў стаў вядомым мастаком яшчэ да пачатку вайны як аўтар малюнка герба БССР 1926 і 1938 гадоў. Па-трэцяе, ён быў сведкам тых падзей: не паспеў эвакуявацца з акупаванага Мінска, бачыў, як жыхары горада сустракалі войскі Чырвонай Арміі.

Майстар разумеў, што кожная дэталь карціны павінна быць дакладная. Для большай праўдзівасці Волкаву былі прадастаўлены трафейны нямецкі матацыкл і пражэктар, з дапамогай якога аўтар імітаваў ранішняе святло. Унук Волкава мастак Сяргей Волкаў успамінаў: «...Я пастаянна бегаў да яго ў майстэрню. Як жа было не бегаць, калі ён пісаў карціну "Менск 3 ліпеня 1944 года", у яго былі вінтоўкі, аўтаматы, кулямёт, каскі!..».

У ПОШУКУ МАДЭЛЯЎ

Па эцюдах відаць, як Волкаў паступова прыходзіў да канчатковага рашэння кампазіцыі. Яна пабудавана на аснове прынцыпу класічнага трыкутніка, у які ўпісваецца цэнтральная група карціны, разбітай на шматлікія мізансцэны. Вянчае вяршыню фігура маладога танкіста з аўтаматам. Іншы раз у групах падспудна адгадваюцца плакатныя вобразы (сцэна поціску рукі салдата і падпольшчыка адсылае да вядомага плаката 1939 года ўз'яднання БССР з Заходняй Беларуссю). Працяглы тэрмін працы над палатном адчуваецца ў дэталях: кветкі ў руках мінчан рознасезонныя: бэз адкрасаваў у ліпені, півоні адцвітаюць да сярэдзіны чэрвеня. Уважлівае вока заўважыць і неадпаведнасць абутку: ёсць босыя жыхары, але на жанчыне ў паласатай спадніцы басаножкі сярэдзіны 1950-х гадоў.

Ужо праз месяц пасля вызвалення Мінска ў 1944 годзе Волкаў і яго старэйшы сын Анатоль, таксама мастак, прайшоўшы праверку-фільтраванне, былі прыцягнутыя для выканання велічэзных пано для Дома ўрада. На іх былі намаляваныя партызан і партызанка. Гэтае пано было выканана Волкавымі літаральна за тыдзень.

Але падчас працы над карцінай Волкаў сарваў усе мажлівыя тэрміны. На яго паступалі скаргі. У яго майстэрню ў канцы 1940-х прыйшоў першы сакратар ЦК КПБ Панцеляймон Панамарэнка: убачыў карціну, ацаніў размах і загадаў працягнуць дамову з мастаком.

Ад Волкава чакалі пафаснай «карціны-трыумфу пераможцаў», паказу яднання Чырвонай Арміі — вызваліцельніцы і народа. Мастак паставіў задачу стварыць гістарычную шматфігурную карціну «вялікага стылю», каб паказаць трагедыю горада і канкрэтных людзей. Складанасць была ў тым, што жыхары горада добра памяталі дзень 3 ліпеня, што накладвала на жывапісца асаблівую адказнасць.

Да канчатковага варыянта кампазіцыі Волкаў прыйшоў не адразу: захавалася 25 варыянтаў невялікіх эскізаў карціны з зусім іншым кампазіцыйным рашэннем, не падобным на канчатковы варыянт. Адмысловую сэнсавую нагрузку нясе гарадскі пейзаж, канкрэтызуючы час і месца дзеяння, — раён сучаснай вуліцы Леніна (тады Ленінскай) і плошчы Свабоды. Мастаку было вядома, што савецкія войскі ўваходзілі ў горад з паўночнага ўсходу і поўдня, аднак дзеянне на карціне мастак перанёс у іншы раён. Гэта рашэнне было прынята, каб паказаць вядомы гістарычны цэнтр Мінска. Цікава, што карціна захавала аблічча званіцы, ацалелай у гады вайны, разбіваючы міф, што Мінск быў цалкам разбураны фашыстамі. (Званіцу знеслі ўжо ў савецкія гады, у 1950-х.)

Для твора пазіравалі рэальныя мінчане — суседзі майстра, салдаты Беларускай ваеннай акругі, сваякі, у тым ліку трэцяя жонка Валянціна Волкава, дачка ад другога шлюбу Ірына (бландзінка ў ружовым каптане і блакітнай спадніцы) і сын мастака ад першага шлюбу Анатоль (мужчына ў белай кашулі, што працягвае руку танкісту), жонка Анатоля і іх сын Сяргей (хлопчык, што бяжыць), які таксама стаў мастаком…

Волкаў жадаў адлюстраваць рэальных людзей розных узростаў, мінчан таго часу. Ён літаральна хадзіў па вуліцах, шукаў патрэбныя тыпажы, прасіў пазіраваць. Не ўсе, але большасць пагаджалася. Вядома, што мадэлямі Волкава былі і мастакі — Мікалай Назаранка, Уладзімір Хрусталёў, Міхаіл Даўгяла са сваёй дачкой Зояй (дзяўчынка з кветкамі ў карычневай школьнай сукенцы з піянерскім гальштукам у левым куце карціны). Усяго ў карціне каля 90 персанажаў, кожны з якіх так ці інакш пазіраваў мастаку. Тут ёсць усе тыпажы: падпольшчык, маці, жонка, сястра, дзеці-піянеры, мудры стары, удзельнік Першай сусветнай войны.

Для цэнтральнай фігуры танкіста пазіраваў 19-гадовы танкіст-сібірак Комлеў, які служыў ва Уруччы. Волкаў пісаў яго на паветры, у двары майстэрні. Калі ён у 1952 годзе закончыў службу, яго змяніў сын сястры першай жонкі мастака літовец Альберт Бейнарт, які гадзінамі стаяў на перавернутай вялікай бочцы з паднятай з аўтаматам рукой, трымаючыся для раўнавагі рукой за вадасцёкавую трубу.

ГАНАРАР НА «ПАБЕДУ»

Карціна была цёпла прынята публікай, адзначалі, што ніхто так старанна не працаваў над стварэннем гістарычнага твора. Але сам мастак, убачыўшы палатно на выстаўцы, застаўся незадаволены, перапісваў карціну зноў і зноў.

Апошні варыянт быў прадстаўлены на Другой дэкадзе беларускай літаратуры і мастацтва, якая прайшла ў Маскве ў лютым 1955 года. Гэта карціна заняла ганаровае цэнтральнае месца ў экспазіцыі беларускага жывапісу ў Акадэміі мастацтваў СССР. Адразу пасля дэкады 30 лютага 1955 года В. Волкаву было прысвоена званне народнага мастака БССР. Карціну як лепшы ўзор беларускага савецкага гістарычнага жывапісу хацела набыць Траццякоўская галерэя, але дырэктар Дзяржаўнай карціннай галерэі Алена Васільеўна Аладава зрабіла ўсё, каб гэтага не здарылася і палатно засталося на радзіме.

Карціну набылі ў 1955 годзе за рэкордную на той час суму ў 150 тысяч рублёў (гэта перавышала ў паўтара разу памер адмененай у 1954 годзе Сталінскай прэміі). Большую частку ганарару майстар аддаў на даўгі за электрычнасць і плату мадэлям, якім ён абяцаў пагадзіннае ўзнагароджанне (у яго на сцяне вісеў ліст уліку іх працоўнага часу). Сабе мастак купіў толькі аўтамабіль «Пабеда М 16» і жалезны гараж, а астатнія грошы сышлі, як казаў унук, «скрозь пальцы», на дапамогу шматлікай радні.

Палатно дэманстравалася ў экспазіцыі Дзяржаўнага мастацкага музея БССР 20 гадоў. У 1975 годзе з'явілася на выстаўцы ў гонар 30-годдзя Перамогі ў нядаўна адкрытым Палацы мастацтваў. Потым, каля 15 гадоў, экспазіцыя сучаснага беларускага мастацтва была згорнута. Знятая з падрамніку, карціна праляжала скручаная ў фондах музея больш за 30 гадоў, але захавалася ідэальна: Волкаў, як мастак старой фармацыі, цудоўна ведаў тэхналогію жывапісу. У яго на падрамніках эцюдаў да карціны былі запісаныя рэцэпты грунтаў, лакаў.

Толькі ў 2005 годзе, да 60-гадовага юбілею Перамогі, карціна зноў была прадстаўлена гледачу ў асобнай зале разам са шматлікімі эцюдамі і дакументальнымі фатаграфіямі. А ў 2008 годзе яна заняла месца ў экспазіцыі пасляваеннага мастацтва ў прасторнай зале з 5-метровымі столямі новага корпуса музея.

ПА-ЗА РЭПРЭСІЯМІ

Волкаў быў жыццялюбам: перажыў трох жонак, да старасці катаўся на каньках, паказваючы розныя фігуры, гуляў у більярд у Доме пісьменнікаў, цаніў добрае марачнае грузінскае віно, быў сталым наведвальнікам мінскай оперы і ведаў на памяць усе арыі тэнараў. Многія яму зайздросцілі, лічылі «панам ад мастацтва», якому сышлі з рук партрэты нямецкіх чыноўнікаў, якія ён пісаў у акупацыі. Верагодна, з-за гэтага быў распушчаны слух, які пераследваў мастака апошнія гады, маўляў, што карціну ён пачаў пісаць у 1942 годзе ў Мінску па замове нямецкіх акупацыйных уладаў, а потым перапісаў, калі змянілася сітуацыя. Доказаў гэтаму няма.

Здавалася, што мастаку даравалі ваенныя гады, праведзеныя ў акупаваным Мінску. Пасля вайны многіх мастакоў, якія засталіся ў акупацыі, саслалі, рэпрэсіравалі за калабарацыянізм — арганізацыю выставак у занятым немцамі Мінску. Волкава і яго дарослага сына Анатоля такі лёс абышоў. Але ён таксама апынуўся заложнікам уладаў: рэпрэсіі закранулі і яго сям'ю ўжо ў пасляваенныя гады, калі мастак працаваў над сваёй галоўнай карцінай. Пасля вызвалення Мінска на дачок ад другога шлюбу быў зроблены данос, у якім гаварылася, што дзяўчаты, якія выдатна ведалі нямецкую мову, супрацоўнічалі з немцамі. І Ніну, і Ірыну саслалі ў лагер. Ніна, старэйшая дачка, там загінула. Волкаву дазволілі паехаць у Сібір на пахаванне. Ірына ў пачатку 50-х гадоў вярнулася ў родны горад, адседзеўшы каля 7 гадоў. Мастак увёў яе ў карціну.

Па значэнні для беларускага савецкага жывапісу XX стагоддзя карціна «Мінск 3 ліпеня 1944 года» параўнальная з шэдэўрамі XIX стагоддзя — «Апошнім днём Пампеі» Карла Брулова альбо «З'яўленнем Хрыста народу» Аляксандра Іванова. Карціна Волкава стала ўзорам для пераймання. У 2008 годзе амерыканскі мастак Сэндоу Бірк напісаў «Вызваленне Багдада. 1991 год», што па кампазіцыі вельмі нагадвае работу Валянціна Волкава. Але гэты своеасаблівы рымэйк яшчэ больш павялічвае значнасць арыгінала.

Карціна «Мінск 3 ліпеня 1944 года» — адно з самых дасканалых тварэнняў Валянціна Волкава і ўзор савецкага «трыумфальнага стылю» эпохі росквіту сацыялістычнага рэалізму, а таксама сімвал Перамогі ў беларускім жывапісе пасляваеннай эпохі.

Надзея УСАВА,
вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь

Дзіка прыгожа…

Калі думаеш, што праехаў-прайшоў па Беларусі, што шмат чытаў-перачытаў пра яе, не пакідаеш сабе магчымасці здзіўляцца. І насуперак любой уласнай (і наогул чалавечай логіцы) часам накрые так, што мову адымае. І не скажаш інакш. Таму што адкрыцці — перад вачыма. Толькі бачыць іх могуць не ўсе. І паказаць могуць не ўсе. І ўразіць. Як рэжысёр Вольга Дашук у дакументальнай стужцы «Сяргей Плыткевіч: чалавек з фотаапаратам» здолела паказаць Беларусь. За апошні час гэта адзін з нешматлікіх айчынных фільмаў (зняты на студыі «Летапіс» «Беларусьфільма»), які пакінуў моцнае і светлае ўражанне і здолеў парушыць звыклае меркаванне, што «каб любіць Беларусь нашу мілую…» Не, не трэба ехаць некуды на край свету. Бо край свету — з усім яго таямнічым чараўніцтвам — у нас. І гэта фантастычна прыгожа.

Кадр з фільма «Сяргей Плыткевіч: чалавек з фотаапаратам».

Кіно, якое можа захапіць Беларуссю… Здавалася, гэта зразумела і бясспрэчна. Але разам з тым не памятаю такіх гарачых спрэчак і бурных дыскусій паводле беларускіх кінакарцін (ігравых, анімацыйных, наогул усіх, што з'явіліся апошнім часам), як пасля дакументальнага фільма Вольгі Дашук «Сяргей Плыткевіч: чалавек з фотаапаратам». Відаць, ёсць розніца ў тым, як успрымаць фільм: розумам ці душой. Таму што калі гаворка пра візуалізацыю нейкай тэмы, было дастаткова дакладнай і сухой логікі, лінейнага расповеду і маштабавання асобы. Калі гаворка пра мастацтва, то ўсё вышэйазначанае ўвасабляецца ў вобразы, прамаўляецца на паўтонах і трансфармуецца ў метафізіку. А гэта тая анамальная зона, дзе простая логіка разам з банальнай эрудыцыяй не працуюць зусім. Ну дык і адкінем іх убок.

Паводле назвы, карціна прысвечана чалавеку, вельмі захопленаму сваёй справай, — знакамітаму фатографу дзікай прыроды Сяргею Плыткевічу. Менавіта яго вачыма мы ўсё бачым. Праз яго пачуцці адчуваем. І баімся дыхаць (так жа, як і ён у момант сваіх фотапаляванняў), каб не спалохаць ціхую здагадку, хто насамрэч галоўны герой гэтай карціны. Таму што чалавек, імя якога стаіць у назве, — хутчэй асістэнт таго, хто быў стваральнікам Першаснасці. Чалавек тут выступае як постстваральнік: фіксуе і ўвасабляе згодна з уласным бачаннем. Гэта яго роля па жыцці: Сяргей Плыткевіч вядомы сёння як фотапясняр жывой, прыроднай прыгажосці Беларусі.

Без лішніх слоў (тут кожны кадр за сябе гаворыць) мы ідзём следам за ім. Едзем па пустых дарогах, уздоўж лясоў, туды, дзе меней людзей. Але там ёсць сваё жыццё, некранутае чалавекам, несапсаванае цывілізацыяй, прыхаванае ад чужых. Зямля яго беражліва захоўвае — не проста ісці па ёй, каб хоць бы толькі пабачыць і зафіксаваць. Уздоўж балота, крок за крокам, правальваючыся ў дрыгву і выбіраючыся зноў і зноў на моцныя купкі, ён перасякае вялікую прастору. Зямля нібыта ўступае ў размову: куды ідзеш, навошта? Стогне ці хлюпае насцярожана: з чым прыйшлі? Не прапускае надта проста, ладзіць выпрабаванне, нібыта вывучае, хто ён: прагматычны здабытчык ці апантаны «знаўца» з рамантыкай пошуку?

А сапраўды, хто?

Дзіўнае пытанне, на якое рэжысёр і не збіралася шукаць адказу. Для Вольгі Дашук ён ужо існаваў, таму і выбрала такога героя для здымак. Таму што з-за вобраза чалавека так ці інакш праглядае звышмэта аўтара фільма: паказаць больш, чым бачна вачыма. Паказаць тое, што ўбачаць яшчэ і душой. Той выпадак, калі да першастваральніка можна наблізіцца толькі разам з постстваральнікам. Ён праваднік. А гэта місія, якая даецца не проста так, а таму што.

І ёсць тлумачэнне — чаму. Лес. Перапынак у фотапаляванні. Якая хвілінка, каб заплюшчыць вочы. І пакуль ён адпачне, мы зазірнём у мінулае. Змяняюцца адзін за адным кадры мітуслівага мінулага журналіста цэнтральнай газеты. Рэпарцёрскае жыццё навучыла лавіць момант. Навучыла бачыць свет і галоўнае ў ім — чалавека (так здавалася тады, гадоў 25—30 таму), які стаіць на шляху пераўтварэнняў. Навучыла ўхопліваць імгненні найбольшых эмоцый, фіксаваць этапныя ці нават эпахальныя падзеі альбо водгукі нерэальных трагедый, якія перажываюць абсалютна рэальныя людзі. Вось нам распавялі сюжэт — усю перадгісторыю, якая падвяла да цяперашняга часу. Распавялі проста і натуральна для гісторыі гэтага чалавека — праз кадры, што зняў ён жа ў розныя часы да таго, як змяніў тэму…

Часы мінаюць. Людзі мяняюцца. Але нешта ўсё ж застаецца. Напрыклад, тая самая прага пошуку ідэалу рэчаіснасці, дзе розныя складнікі ўтвараюць агульную і гарманічную сістэму.

Тут дрэвы перамаўляюцца ледзь улоўнымі подыхамі, разумныя травінкі могуць стаць апірышчам і нават фатэляй для вандроўніка. Птушкі ведаюць, пра што і як паразмаўляць з нечаканымі гасцямі-арнітолагамі ды краязнаўцамі, якія назіраюць, але пры неабходнасці прыйдуць на дапамогу. Птушкі ў фільме — быццам крылатыя мары: гаспадары вышынь і абшараў здольныя бачыць далёка, але парушыць іх існаванне вельмі проста. Адзін няправільны крок… Да іх вышынь хочацца ўзняцца і зазірнуць туды, дзе гняздуюць крылатыя. Ох!.. Дух захоплівае, калі кінакамера ўзлятае на вершаліну дрэва разам з чалавекам. Лес наогул для смелых і для тых, хто ведае, што ў самоце тут не застанецца. Ёсць сярод людзей тыя, хто ў наш час зручнасцей імкнецца быць бліжэйшым да прыроды, жыць натуральнай гаспадаркай. Для кагосьці яны дзівакі. Але прырода іх прыняла як сваіх дзяцей — мы завітваем у госці да хутаранцаў, якіх паклікала зямля. І тут, здаецца, багата працы ў фатографа-краязнаўцы. Вось хоць словам перамовіцца, каб потым пайсці і доўгімі напружанымі гадзінамі назіраць за высокай травой у полі, дзе раптам заяц прашмыгне ці нечакана спыніцца касуля са здзіўлена-спалоханымі вочкамі…

Каб зразумець чалавека, часам не трэба праводзіць з ім доўгіх размоў — дыялогі ў фільме ў выніку ператварыліся ў невялікія маналогі героя, што становяцца фонам-тлумачэннем таму, што мы бачым.

І ў гэтым самая вялікая загадка фільма. Яна ў тым, што прымушае гарадскога паспяховага чалавека ехаць далёка ад дому, праводзіць гадзіны і дні ў сырых балотах ці пустых палях без аніводнага чалавека — і ўсё толькі каб заспець адно непаўторнае імгненне. Яно ўразаецца ва ўяўленне, падкідвае і навявае новыя вобразы, якімі трэба сілкаваць уяўленне далей і ціха радавацца: сюды дапушчаны не кожны. Гэта як жанчыну без макіяжу пабачыць — той, хто кахае, адчуе яе сапраўдную. Так і Беларусь: ранішняя і паўсонная ці ў празрыстым тумановым покрыве, яна адкрываецца шчыра і пяшчотна тым, хто зачараваны і шчыра любіць. Можа быць, нават не задумваючыся пра тое, проста выконваючы свае прафесійныя абавязкі. Але сутнасць у тым, «як».

Нездарма кажуць: хочаш лепш зразумець чалавека, даведайся, што ён любіць. Гэтым шляхам пайшла рэжысёр. Яна прыадкрыла таямніцу адной з галоўных любовей у жыцці свайго героя, якая вызначыла яго стыль жыцця і стала натхняльніцай.

Зачараваць Беларуссю праз здымкі без любові не атрымалася б. А фатограф Сяргей Плыткевіч зачароўвае. А яны — рэжысёр Вольга Дашук і кінааператар, аўтар фантастычнага відэараду Анатоль Казазаеў — захапляюць. Кожны бок выказаўся на сваёй мове. Высвятленне пасляпрэм'ерных пытанняў можа быць звязанае з тым, што немагчыма без страт перакладаць з мовы аднаго мастацтва на мову другога мастацтва (ці незразумела пры перакладзе). Аднолькава проста на гэтых мовах зразумець адно: любоў. Але гэта пачуццё, прырода якога неспазнаная да канца, як і механізм яго ўтварэння. Затое аб'ект любові тут яднае і героя, і стваральнікаў фільма. І звышмэта насамрэч адна.

Таму захацелася напісаць пра стужку менавіта цяпер. Гаворыць любоў?..

Ларыса ЦІМОШЫК

«Оскар» прыглядаецца

Беларускае кіно на чырвоных дарожках

Беларускі фільм упершыню стане намінантам сусветнай кінапрэміі «Оскар». Кінастужка маладога рэжысёра Дар'і Жук пад назвай «Крышталь» будзе прэтэндаваць на прэмію ў катэгорыі «Найлепшы фільм на замежнай мове». Пра гэта стала вядома пасля прэм'еры на фестывалі ў Карлавых Варах.

Дар'я Жук пераехала з Беларусі ў ЗША ва ўзросце 16 гадоў, скончыла Гарвардскі і Калумбійскі ўніверсітэты. Яна з'яўляецца рэжысёрам і прадзюсарам шматлікіх кароткаметражных фільмаў, некаторыя з іх удзельнічалі ў кінафестывалях па ўсім свеце. Карціна «Сапраўдная амерыканка», акрамя іншых адзнак, узнагароджана дыпломам Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад-2015».

«Крышталь» — гэта першы поўнаметражны фільм Дар'і Жук. Здымкі яго праходзілі ў Беларусі. У стварэнні карціны ўдзельнічалі Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм», кінакампанія «Дэмарш-фільм», кампаніі *Unfound Content*, *Fusion Features*, *Vice Films* (ЗША).

Дзеянне фільма адбываецца ў 1996 годзе. Дзяўчына працуе дыджэем у Мінску і збіраецца пераехаць у Чыкага, каб удасканальвацца ў прафесіі. Праз памылку ў афармленні дакументаў на візу гераіня вымушана правесці тыдзень у маленькім горадзе, які моцна адрозніваецца ад горада яе мары, сярод людзей, якія зусім не падобныя да яе.

Фільм ужо атрымаў узнагароду ў секцыі *Work in Progress* на міжнародным кінафестывалі «Цёмныя ночы» ў Эстоніі.

У айчынным кінапракаце «Крышталь» з'явіцца напрыканцы жніўня.

Дар'я СМІРНОВА

Заданне на «Заўтра»

Айчынны фільм чакае прэм'ера ў Францыі

Фільм Юліі Шатун «Заўтра», які назвалі лепшай ігравой карцінай Нацыянальнага конкурсу ММКФ «Лістапад» 2017 года, возьме ўдзел у XXIX Міжнародным кінафестывалі ў Марселі. Фестываль будзе праходзіць з 10 па 16 ліпеня. Такім чынам, адбудзецца міжнародная прэм'ера беларускага фільма.

Галоўны герой — былы настаўнік англійскай мовы з Мазыра. Паміж спробамі знайсці новую працу ён разносіць рэкламу па паштовых скрынках. Акрамя таго, герой мае жонку, сын яго навучаецца ў Мінску, а ў кватэры не скончаны рамонт… Пра будзённае жыццё ў беларускім горадзе з насельніцтвам каля 100 тысяч чалавек расказала маладая дзяўчына ў сваім першым поўнаметражным фільме. Юлія Шатун сама выступіла і рэжысёрам, і сцэнарыстам, і прадзюсарам і здолела ўразіць кінаграмадскасць краіны праўдзівасцю і вострым адчуваннем рэчаіснасці.

Стужка будзе прадстаўлена на кінафестывалі ў Марселі адразу ў трох конкурсах: міжнародным, конкурсе дэбютаў і конкурсе асацыяцыі французскіх кінатэатраў *GNCR*. Фільм пакажуць у новай, пашыранай версіі. Магчыма, яе ўбачаць і беларускія гледачы, калі фільм неўзабаве выйдзе ў айчынны кінапракат.

Мікіта ШЧАРБАКОЎ

ПОШУКІ ІСЦІНЫ

Жаночае наканаванне даследавалі ў спектаклі без слоў

Маці, каханая, гаспадыня, надзейны «тыл» для мужчыны ў розных жыццёвых абставінах. Побач — ваяўніца, царыца, настаўніца, даследчыца, рэвалюцыянерка. Распрацаваны сотні ролевых мадэляў для існавання жанчыны ў соцыуме, і ніводная з іх не можа цалкам вызначыць яе наканаванне на зямлі. Заўважце: у параўнанні з мужчынам месца жанчыны ў жыцці часцей вымяраецца ў дачыненні да іншых людзей, акрэсліваецца праз яе ролю ў сям'і, а не асабістыя якасці. Узнікае пытанне: што ёсць яе «сапраўднае наканаванне» і ці маюць рацыю тыя, хто кажа пра яго існаванне? Адказы шукалі ў пластычным спектаклі «Другі пол» ад тэатра «Інсайт», які паказалі ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў (Незалежнасці, 47).

Тэатр «Інсайт» вызначае сябе як «тэатр свабоды, смелай творчасці і натхнення». «Інсайт» адносна малады: «Другі пол» — другая пастаноўка ў яго рэпертуары і першая без слоў, у пластычнай форме. Тэатр знаходзіцца на шляху да прафесійнага станаўлення, але ўжо вызначыўся з тэматычным колам спектакляў. Калектыў робіць акцэнт на актуальных сацыяльных праблемах, даследуе розныя праявы жыцця.

Адна з праблем, якія зацікавілі тэатр, — дагэтуль не канчаткова высветленае месца жанчыны ў свеце. Тэма надзённая: рух фемінізму не страчвае пазіцый і цяпер, праз два стагоддзі з моманту свайго ўзнікнення. У XXI стагоддзі пытанні гендарнай дыскрымінацыі паўстаюць не так востра, як раней, але маюць месца быць, і нярэдка праз стэрэатыпы — устойлівыя мадэлі паводзінаў, што выконваюцца без усведамлення. Платформа для дыялогу з грамадствам з цягам часу таксама змянілася: у эру камп'ютарных тэхналогій неабавязкова выходзіць на вуліцы (але трэба адзначыць, што сучасныя феміністкі не адыходзяць і ад такіх праверaных метадаў), каб цябе пачулі. Дастаткова знайсці шлях у інтэрнэт-прастору: на старонках сацыяльных сетак і на канале *YouTube* створаныя сотні адмысловых суполак. На жаль, тое, што дапамагае напрамую дагрукацца да людзей, спрацоўвае і ў адваротны бок: праз вялікую колькасць інфармацыі ідэі губляюцца, права слова атрымліваюць недасведчаныя ці занадта радыкальныя асобы, якія псуюць агульнае ўражанне аб актывістах руху. Але, нягледзячы на ўсе недарэчнасці, колькасць тых, хто цікавіцца пытаннямі сучаснага фемінізму, не змяншаецца, і спектаклі накшталт «Другога полу» дапамагаюць перакласці нявырашаныя праблемы на мову мастацтва.



Фота Марака Пяткевіча.

Сцэна са спектакля «Другі пол».

Трупа тэатра не толькі выказвае ўласныя думкі, але і цікавіцца меркаваннямі грамадскасці: на імправізаванай сцэне ў НЦСІ гледачоў сустракалі два белыя аркушы паперы з пытаннямі «Які гендарны стэрэатып раздражняе вас больш за астатнія?» і «Прыклады гендарнай дыскрымінацыі, з якімі вы сутыкаліся». Пад пытаннямі — мноства адказаў, напісаных як удзельнікамі тэатра «Інсайт», так і наведнікамі НЦСІ. Кагосьці турбуе выснова «Усе жанчыны — дрэнныя кіроўцы», хтосьці непакоіцца наконт сцвярджэння аб тым, што «жанчыны слабыя», нехта вар'яцее з-за фармулёвак «Сапраўдная жанчына павінна…», «Сапраўдны мужчына павінен…». Заўважна, што сярод прыкладаў сустракаліся скаргі не толькі на дыскрымінацыю жанчын: гэта тая з'ява, з-за якой часам пакутуюць абодва палы.

Сам спектакль атрымаўся мінімалістычны, выкананы ў сціплых дэкарацыях з выкарыстаннем невялікай колькасці рэквізіту. Гэта добра дапасавалася да пластычнага дзеяння: калі акцёры размаўляюць з аўдыторыяй праз уласнае цела, нельга адцягваць увагу ад рухаў і эмоцый. Звярнуліся і да класічных элементаў — масак грэчаскага тэатра і катурнаў, стылізаваных пад стосы кніг. Кнігі — сімвал ведаў, назапашаных чалавецтвам. На жаль, яны часам скарыстоўваліся не толькі як інструмент асветніцтва, але і дзеля прыгнёту пэўных груп насельніцтва. Рэлігія таксама мела дачыненне да несправядлівасцяў, і вось рэфрэнам гучаць радкі з Бібліі «Жонкі, падпарадкоўвайцеся сваім мужам як Госпаду», а вясельны вэлюм хавае сапраўдны жаночы твар, перашкаджае рухацца, замінае праяўляць характар…

Даследаванне праблемы, абазначанай нават у самой назве пастаноўкі, рэжысёр Вольга Бялова правяла маштабна. Каб праліць святло на спрэчныя пытанні сучаснасці, пошукі пачалі ад каранёў праблемы. Дакладней — са з'яўлення чалавецтва. Гісторыя пра Адама і яго рабро тут не «пакаціць»: увага — на жанчыне, яе станаўленні і развіцці. Жанчыны і мужчыны абуджаюцца ад вечнага сну, на роўных даследуюць невядомы свет і яго дзівосы. Цікава паказаны працэс знаёмства адно з адным: людзі-дзікуны то рычаць і кідаюцца ў бойку, то распачынаюць гульні, якія паступова пераходзяць у любоўныя заляцанні. З гульні ў каханне ў спектаклі ўзнікае тэма гвалту над жанчынай: занадта грубы мужчына раз за разам пераводзіць каханне ад пяшчоты да знявагі. Падчас прагляду пастаноўкі здаецца, што жанчына заўсёды павінна плаціць асабістым болем за блізкія стасункі з іншым полам. Вядома, гісторыямі нешчаслівага кахання свет поўніцца, але… Калі не ўспрымаць дзеянне як вялікую метафару, можа атрымацца недакладнасць і чарговы стэрэатып, ад якіх нас запрашае пазбавіцца спектакль.

Тэма гаспадарчых заняткаў (без яе нельга ўявіць ніводнага расповеду пра жаночую долю) праз пластыку ўзнятая небанальна. Хатнія справы захлынаюць актрыс, і вось пачынаецца інфернальны танец на мяжы з вар'яцтвам: мыццё ды шыццё, шыццё ды мыццё, і не адарвацца ад працэсу, не вырвацца з бясконцага кола… Нарэшце, надыходзіць новае стагоддзе і новыя патрабаванні. Жанчыны і мужчыны ў аднолькавых касцюмах рытмічна маршыруюць пад мелодыю часу, рухаюцца наперад з пятлёй на шыі замест гальштука. І калі Мужчына ўпэўнена стаіць на нагах, Жанчына рвецца паміж ім і сваімі сёстрамі, кар'ерай і… «жаночым шчасцем»? Нарэшце, гэта і ёсць галоўная праблема: з дыскрымінацыяй ці без яе, пад прыгнётам стэрэатыпаў альбо біялагічных даных вынік відавочны: нашы сучасніцы «завіслі» паміж домам і працай, мацярынствам і кар'ерай. Што б ні было прычынай, якая прывяла да гэтай дуальнасці, факты кажуць: жанчыны імкнуцца ўсё паспець і сумясціць. Толькі рэалізавацца на ўсе 100 працэнтаў у абедзвюх супрацьлеглых сферах для жывога чалавека, а не робата, які не мае патрэбы ў адпачынку, немагчыма. Трэба рабіць выбар — той выбар, які амаль ніколі не паўстае перад мужчынам. Адсюль пакуты сумлення, трывога і адчуванне няшчасця. Але ці існуе ўвогуле адназначны адказ на ўзнятае пытанне? Дуальнае існаванне складанае, але мае і свае плюсы: нездарма кажуць, што ў білінгваў (знаёмая беларусам сітуацыя!) лепш развітыя моўныя здольнасці, больш гібкае мысленне. Шматзадачнасць сучаснай жанчыны выводзіць яе на новую ступень, часам недасяжную тым жа мужчынам. Але лёгка нічога не даецца, за ўсё ў жыцці даводзіцца плаціць...

У выніку атрымаўся эмацыянальна насычаны, месцамі гіпербалізаваны, але па-мастацку праўдзівы спектакль, калі мець на ўвазе, што «Другі пол» заяўлены як спектакль-разважанне і разважаюць там над падзеямі, якія прывялі да ўзнікнення саміх паняццяў «слабага» і «другога» полу. Акцэнт — на момантах гістарычнага прыгнятання, на пакутах і болі. Так, у гісторыі жаночага полу былі і светлыя старонкі, а ў самыя цёмныя часіны мужчынам прыходзілася не надта лепей. Але — гаворка не пра іх. Гэтым разам на споведзь без слоў прыйшла Жанчына.

Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ

Рэжысёр спектакля «Другі пол», мастацкі кіраўнік тэатра «Інсайт» Вольга Бялова:

— Чаму вы абралі тэму дыскрымінацыі жанчыны для стварэння спектакля?

— У сучасным свеце вельмі важна казаць пра гэту сітуацыю: праблема ролі жанчыны ў жыцці народа, яе адлюстравання ў грамадскай думцы дасюль існуе. На першы погляд можа падацца, што мы дамагліся абсалютнай роўнасці, але пэўная дыскрымінацыя яшчэ засталася. За прыкладамі не трэба хадзіць далёка. Калі мы толькі пачалі абмяркоўваць гэтую тэму ў сваёй трупе, частка калектыву (асабліва мужчыны) не вельмі зразумела, пра што ідзе гаворка, дзе тут праблема? Адзін з былых удзельнікаў тэатра нават дазволіў сябе зневажальны каментарый у бок жанчын. Гэта сведчыць пра тое, што праблема дыскрымінацыі насамрэч існуе і паўстае востра, нават калі не ўсе мы гэта ўсведамляем. Гендарныя стэрэатыпы так моцна ўкараніліся на штодзённым узроўні, што часам іх нават не заўважаюць. З дзяцінства жанчын гадуюць як класічных «дзяўчат», і пасля, у працэсе сталення, атрымліваецца, што яны з самага пачатку не прыстасаваныя да таго, каб цалкам праявіць сябе ў гэтым «мужчынскім» свеце.

— Спектакль «Другі пол» пластычны. Як вы прыйшлі да такой тэатральнай формы?

— Першапачаткова ў нас з'явілася жаданне зрабіць пастаноўку на «жаночую» тэму. Ужо падчас падрыхтоўкі спектакля мы зразумелі, што, калі прагаворваць праблему вербальна, яна не будзе мець таго неабходнага эфекту, які атрымаецца, калі выказаць яе праз чалавечае цела. Цела, у адрозненне ад слоў, не можа хлусіць, яно абсалютна адкрытае і безабароннае. Дзеля найбольшай выразнасці думкі вырашылі пайсці шляхам эксперымента. Было і цікава, і складана: мы яшчэ ніколі не працавалі з пластычнай формай. Для падрыхтоўкі спектакля запрасілі харэографа, разам з якой шукалі самае дакладнае адлюстраванне нашых вобразаў і ідэй. У выніку паставілі «Другі пол» крыху менш як за тры месяцы.

— Фінал спектакля падаецца крыху змрочным і неадназначным…

— Фінал п'есы — пра тое, што ўнутры жанчыны ёсць асабістыя ваганні. І справа ўжо не ў грамадстве, якое стрымлівае яе памкненні. Жанчына не можа вызначыцца са сваёй пазіцыяй сама, мае месца ўнутраны канфлікт. З аднаго боку, ёй хочацца адпавядаць традыцыйнаму біялагічнаму прызначэнню, мець сям'ю, быць каханай; з іншага боку, цяпер ёсць паняцце кар'еры, магчымасць займацца цікавай і патрэбнай справай. Гэтыя моманты супярэчаць адно аднаму і ставяць жанчыну перад такой сітуацыяй, як выбар. Параўнайце: у мужчын выбару паміж сям'ёй і кар'ерай не стаіць. Таму фінал застаецца адкрыты: трэба неяк вырашыць праблему, дапамагчы жанчыне пазбавіцца ўнутранага канфлікту. Гэта магчыма, але не сёння і не заўтра. Пасля прагляду нашага спектакля глядач не выйдзе з залы з канчатковым рашэннем на ўсё жыццё, але — хто ведае? — раптам наступнаму пакаленню, якое мы ўзгадуем, пашанцуе больш? Магчыма, яны будуць жыць у свеце, дзе ўсе маюць роўныя магчымасці, нават на ўзроўні мыслення.

— Пастаноўка «Другі пол» праблемная па сваёй тэматыцы. Ці часта тэатр «Інсайт» звяртаецца да вострых надзённых пытанняў?

— Мы заўсёды абіраем праблемныя спектаклі. Так, першая пастаноўка тэатра была прысвечана самаасэнсаванню чалавека, — сітуацыі, калі людзі не ведаюць, што рабіць па жыцці, не маюць мараў і крочаць па пракладзенай дарожцы. Зараз «Інсайт» знаходзіцца ў пошуку новай болевай кропкі, тэмы, якой варта прысвяціць новы спектакль. Пакуль невядома, што гэта будзе: мы адштурхоўваемся ад таго, што цікавіць нас і грамадскасць, а потым шукаем патрэбны матэрыял.

З багатымі ФЭНТЭЗІямі

Спевы лясоў і балот у містычным шоу

Група *«Irdorath»* утварылася ў Гродне: дуэт вулічных музыкантаў Уладзіміра і Надзеі вырас да вялікай групы. Калектыў звярнуў на сябе ўвагу з першых жа запісаў — арыгінальным гучаннем, інструментамі, знешнім выглядам: фолк-рок і сярэднявечныя тэмы. І да сваёй трэцяй пласцінкі *«Wild»* група *«Irdorath»* падышла ў статусе калектыву з міжнароднай вядомасцю і загучала па-стадыённаму: яе палюбілі ерапейскія фестывальныя сцэны. Сваю музыку творцы называюць «фэнтэзі-рокам». На сцэне ў іх — сапраўднае беларускае «фэнтэзійнае» шоу. У гэтым жанры ім удалося дасягнуць вяршыняў, што дагэтуль не пакараліся іншым беларускім музыкантам…

Гурт «Irdorath» падчас канцэрта.

Уладзімір: Сапраўды, калісьці мы пачыналі іграць на вуліцах, у нас быў дуэт. Іграліі папулярную сярэднявечную музыку. Нам тады хапала тагачасных мелодый і вулічнага перфомансу. А потым захацелася большага, развіцця, нашы музычныя амбіцыі ўжо не ўмяшчаліся ў фармат дуэта. І мы знаходзілі новых людзей, аднадумцаў. Яны далучаліся да нас і дадавалі сваю творчасць, ідэі. У выніку мы пачалі адыходзіць ад сярэднявечнай праграмы, бо яна была ўжо зайграна шмат кім і да нас.

Працягвалі шукаць уласны шлях. У нейкі момант група захапілася вялікімі формамі, і нам хацелася на гэтым прыпыніцца — каб многа музыкантаў, каб моцна і канцэптуальна! Аднак умяшаліся жыццёвыя рэаліі. Вялікім калектывам, з мноствам музыкантаў і інструментаў мы не маглі хутка рухацца, перамяшчацца ў прасторы, не маглі сарганізаваць усё з фінансавага боку. На прыкладзе нашага другога альбома — *«Dreamcatcher»* — мы зразумелі, што зрабілі максімум магчымага з такім складам у Беларусі. Мы рэалізавалі сваю задумку і дасягнулі таго, што ў нас на сцэне часам было ажно 14 музыкантаў! Так было на прэзентацыі альбома *«Dreamcatcher»*. Аднак мы не змаглі болей збіраць такі склад і ездзіць з ім па фестывалях. А запрашаюць нас выступаць даволі далёка — што на Захад, што на Усход. Вось так мы і зразумелі, што трэба рабіць музыку, якую мы зможам іграць сваім пастаянным, лаканічным складам, і адмовіліся ад вялікіх форм. У выніку ўсё да лепшага: знайшлі сваё цяперашняе гучанне, якое і дазволіла нам зрабіць значны скачок у кар'еры і знайсці сваю, вельмі немаленькую аўдыторыю.

— Ці вялікая адлегласць паміж дэбютнай пласцінкай і трэцяй?

Надзея: Наш першы альбом быў яшчэ даволі просты. Нам было радасна ўжо ад самога факта, што мы здолелі яго запісаць. У другой пласцінцы мы пагналіся за масавасцю, каб было многа музыкантаў, многа пафасу, готыкі. А вось у трэцяй пласцінцы *«Wild»*, мы лічым, удалося знайсці свой твар. Выключна акустычнымі сродкамі, акустычнымі інструментамі, такімі як нямецкая валынка, калёсная ліра, скрыпка, бузукі, 12-струнная гітара і барабаны (сапраўды, ніякай электрычнасці), мы змаглі дасягнуць такога гуку, такой падачы, што нашу музыку пачалі называць фолк-металам! І з гэтай праграмай мы шмат выступаем на метал-фэстах.

Уладзімір: Пасля таго, як мінулай восенню выдалі гэты «дзікі» альбом, мы адыгралі больш за 20 канцэртаў у яго падтрымку. У нас быў і расійскі тур, выступілі і на некалькіх фестывалях у Германіі. У тым ліку і на гатычным фестывалі *«Autumn moon»* прэзентавалі пласцінку з поўным шоу, што потым зрабілі і ў Мінску. Прымалі альбом «на ўра». Было адчуванне, што мы зрабілі вялікі крок, скарылі вяршыню і добра на ёй замацаваліся. Упэўніліся, што ўсё робім правільна і натхніліся на далейшую працу.

— Як склаліся стасункі з музычнай супольнасцю Германіі?

Надзея: Германія — гэта цэнтр Сусвету, дзе жывуць і працуюць фолк-калектывы. Там неверагодная колькасць фэнтэзі-фестываляў, якіх у нас у Беларусі проста няма. Там існуе гэтая субкультура. І там вялікая канкурэнцыя сярод падобных музыкаў, што нам вельмі падабаецца. У нейкі момант мы заўважылі, што ў суполцы нашай групы на фэйсбуку каля 70 працэнтаў падпісчыкаў — немцы. Мы з'ездзілі на нямецкі фэст, другі, трэці. І нас там прыкмеціў адзін германскі лэйбл. У выніку мы на ім зрабілі спецыяльнае нямецкае перавыданне альбома *«Dreamcatcher»*. І калі ўжо рыхтавалі альбом *«Wild»*, у нас не было пытанняў, на якім лэйбле яго выдаваць. Тым больш што наша нямецкая, еўрапейская аўдыторыя з таго моманту значна паболела, таму што мы выступілі на самым буйным у свеце гатычным фестывалі, а потым на найбуйнейшым фестывалі метал-музыкі *«Waken open air»*. Для нас гэта было здзяйсненнем самых неверагодных мараў, таму што на гэтым жа фестывалі побач з намі выступалі такія легенды, як Эліс Купер, Мэрылін Мэнсан, група *«Apocalyptica»*. І тут раптам разам з імі — *«Irdorath»*! Нейкі шок і для нас, і для нашых паклоннікаў. Даведаліся, што мы былі першымі і адзінымі беларусамі, што выступалі на гэтым фестывылі за ўсю яго гісторыю ў 28 гадоў. Дарэчы, адметны факт — на сцэне *Waken* я сустрэла сваё 28-годдзе...

— Вы на сцэне і вяселле калісьці адзначалі...

Уладзімір: Ды ўсё нашае жыццё на сцэне праходзіць! І ажаніліся мы таксама на сцэне, у Мінску — падчас канцэрта ў клубе, і, такім чынам, у нас на вяселлі было каля 600 чалавек.

— Што адметнага ў вашым трэцім альбоме *«Wild»*?

Надзея: Мы заўсёды імкнуліся ствараць *«Irdorath»* не як проста музычны праект, а як цэлы свет, у які самі хочам верыць. І альбом апісвае гэты свет знутры. Там ёсць асобныя гісторыі пра містычных персанажаў, якія жывуць у гэтым свеце, ёсць глыбока балотныя песні, такія як «Жахі-жахі». І гэтая кампазіцыя нават пачынаецца з квакання жабаў. У гэтым свеце жыве і дзева, ад сустрэчы з якой людзі літаральна вар'яцеюць. Ёсць песня пра дзяцей, што заблукалі ў лесе… Альбом вельмі лясны, насычаны вобразамі і водгукамі славянскага фальклору. Напоўнены прыгодамі і здарэннямі. Аднак гэта падаецца праз прызму нашай фантазіі.

Уладзімір: Можна сказаць, што гэта фэнтэзі на тэму беларускага фальклору, беларускай міфалогіі. І ў гэтым альбоме ў нас большасць кампазіцый на беларускай мове. Гэта дазволіла зрабіць наша Муза, што прыйшла да аўтара тэкстаў, — да Надзеі.

Надзея: Мне хацелася б расказаць пра кампазіцыю «Купала на Йвана», якая адрозніваецца ад астатніх. Тут народныя словы, а мелодыю мы крыху змянілі. Песня сама па сабе ўнікальная: не абрадавая, не купальская. Наўрад ці які іншы ансамбль узяў бы ў рэпертуар гэтую песню, таму што яна не традыцыйная, не вясёлая. «Купала на Йвана» — гэта проста рэфрэн, дэкарацыя, на фоне якой адбываецца трагедыя…

А яшчэ ёсць бонус-трэк — *«Adde duos»*, і кліп ёсць на гэтую кампазіцыю. Тэкст на латыні са зборніка сярэднявечнай лірыкі «Карміна бурана», які цудам ацалеў у часы інквізіцыі. *«Adde duos»* (што значыць «дайце двойчы») — спеў пра сквапнасць ад імя багацця, якое пытае ў людзей: «Ці жадаюць яны разбагацець?» Тыя адказваюць: «Канешне, дайце двойчы!»...

— Вы прадстаўляеце ў Еўропе беларускую музыку. Думаеце пра гэта як пра місію?

Надзея: Напачатку не было мэты паказваць людзям, што такое Беларусь. Гэта прыйшло, калі мы пачалі выступаць на еўрапейскіх сцэнах, дзе амаль ніхто слова «Беларусь» не чуў. І нам не хацелася паказваць аўтэнтыку — імкнуліся адкрыць ім прыцягальную, містычную краіну. З яскравымі прыгожымі людзьмі ў дрэдах!.. Мы прадстаўляем на сцэне тую частку Беларусі, якая нас натхняе. Імкнёмся, каб людзі, што не ведаюць пра Беларусь, зацікавіліся нашай краінай. Што мы і рабілі ў альбоме *«Wild»*. Натхніліся тымі праявамі беларускай культуры, якія ніхто чамусьці не выкарыстоўвае, не робіць з гэтага нешта смачнае, не распаўсюджвае па свеце. Мы захапіліся самі і хочам, каб гэта палюбілі іншыя.

Уладзімір: Яшчэ адзін прыкметны момант: гэты альбом мы запісвалі самі, на сваёй студыі, а саўндпрадзюсарам стаў наш барабаншчык і мультыінструменталіст Антон Шніп. Ён жа і адзін з натхняльнікаў усёй групы *«Irdorath»*. У яго атрымалася тое, што мы хацелі і чаго будзем прытрымлівацца далей.

— Да якога ўсё ж стылю вас можна далучыць, калі тут акустыка і метал, народныя песні і аўтарскія?

Надзея: Калі казаць тэрмінамі, то самы блізкі «пэган-фолк», «нэа-фолк» — так называюць сябе групы, што выступаюць разам з намі на фестывалях. Але мы сваю творчасць называем «фэнтэзі-фолк».

Уладзімір: Мы ведаем, што робім унікальны прадукт. І ні ў якім разе не збіраемся браць у рукі электрагітары, каб стаць сапраўдным металам, ці адмовіцца ад валынак ці другога барабаншчыка таму, што з адным барабаншчыкам больш зручна. І ў гэтым таксама наша ўнікальнасць.

Надзея: На сцэне мы ствараем шоу. У нас там стаяць вялізныя крылы дракона, у нас насатыя боты і класныя касцюмы. І мы ствараем цэлы свет не толькі музычна, але і візуальна. Людзі вераць у тое, што мы робім. Мы самі верым, і людзі вераць. І нельга проста паслухаць запісы і зразумець што такое *«Irdorath»*. Трэба яшчэ і ўбачыць.

Гутарыла Надзея КУДРЭЙКА

Сілуэты Спадчыны

Аўтарскі праект Уладзіміра Цвіркі

ЗАКАЗЕЛЬ

Кветка Палесся! Па-добраму зайздрошчу таму, хто здолеў літаральна ў двух словах выказаць усю чуллівасць, прыгажосць і каштоўнасць гэтай вытанчанай капліцы, якая цудам захавалася ў межах былога Пінскага княства, частка якога цяпер вядома як Драгічынскі раён.

Круцілася ў галаве: трэба ехаць і глядзець. Глядзець і ўяўляць, можа, нават зусім неверагоднае — дзе вы маглі б быць гаспадарамі гэтых мясцін. Архітэктарамі і будаўнікамі гэтага цаглянага цуду. Звычайнымі вернікамі, якія зранку ці ўвечары зайшлі сюды на імшу. Ці яшчэ цікавей — быць у марах сведкамі і будаўніцтва, і ўсяго доўгага і насычанага жыцця капліцы да таго моманту, як пачалося яе разбурэнне праз нечалавечае жаданне сцерці з твару зямлі такую прыгажосць. І тут паўстае пытанне: як бы вы сябе павялі пры такіх абставінах, што б зрабілі, каб абараніць капліцу, каб не дапусціць страшэннага вар'яцтва?

Але вось вы скінулі з сябе покрыва чараў і з палёгкай уздыхнулі, вярнуўшыся ў сучаснасць. Тут усё спакойна, утульна. Вы на траве, побач капліца.

Настойліва прабівалася пытанне: «Што мы робім, каб гэтая кветка не знікла назаўсёды?»

Калі ў 1867 годзе ўлады паспрабавалі перабудаваць капліцу, другімі словамі, знішчыць яе эстэтыку, вытанчанасць і непаўторнасць, мясцовы люд, уласнікі некалькіх навакольных сядзіб дружна выступілі ў абарону заказельскай святыні. І толькі дзякуючы гэтаму калектыўнаму супраціву, грамадзянскаму ўчынку мы можам сёння цешыць вока рэдкай архітэктурнай пабудовай.

Згадваецца Заказель амаль з XIII стагоддзя. З 1521 года паселішча — каралеўская маёмасць у межах Вялікага Княства Літоўскага. З пачатку XVIII стагоддзя новымі гаспадарамі сталі прадстаўнікі шляхецкага роду Ажэшкаў.

Капліца па прызначэнні — родавая пахавальня Ажэшкаў, была ўзведзеная з цэглы ў рэтраспектыўна-рускім стылі па праекце вядомага на той час польскага архітэктара Францішка Яшчальда.

Даследчыкі даўніны і сёння ў адзін голас сцвярджаюць, што перад намі адзін з рэдкіх (і не толькі для нашай краіны) помнікаў архітэктуры, які адметны кампазіцыяй, высакаякасным матэрыялам і прафесійнай працай будаўнікоў, вонкавым і ўнутраным дэкорам такой насычанасці і складанасці. Некалі ў капліцы быў дах з якасных медных лістоў, над якім велічна ўздымаўся вытанчаны шпіль з літым крыжам. Дарэчы, паводле аднаго падання, у гераічныя часы паўстання 1863—1864 гадоў пісьменніца Эліза Ажэшка хавала ў невялічкім патаемным памяшканні пад гэтым шпілем параненага генерала Рамуальда Траўгута, найбліжэйшага паплечніка Кастуся Каліноўскага.

Над кутамі даху, якія былі ўпрыгожаныя спаранымі контрфорсамі, імкнуліся ўгару невялічкія вежачкі, побач з якімі стаялі скульптуры евангелістаў у чалавечы рост, якія, мабыць, першымі і былі разбураныя ці скрадзеныя. Самі вежы цяпер у вельмі дрэнным стане. Галоўны шпіль над дахам яшчэ ў канцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя трымаўся, але сёння яго няма. Медны дах, які падчас Першай сусветнай вайны быў зняты, пасля аднавілі, але з цягам часу і ён страціў сваю галоўную функцыю — сцерагчы будынак ад непагадзі.

Дык усё ж, што зробім мы, каб палеская кветачка не згінула ў адзіноце, каб ужо заўтра, адчуўшы нашу агульную дапамогу, яна перастала баяцца бязлітаснага часу?

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Ларыса Іванаўна ЦІМОШЫК

Рэдакцыйная калегія:
Тацяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 292-20-51
намеснік галоўнага рэдактара — 292-43-03
адказны сакратар — 292-20-51
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 292-56-53
аддзел прозы і паэзіі — 292-56-53
аддзел мастацтва — 292-20-51
бухгалтэрыя — 287-18-14

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ

Нумар падпісаны ў друк 05.07.2018 у 11.00

Ум. друк. арк. 3,72

Наклад — 1303

Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Індэкс 220013

Заказ — 2584

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе, не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.